Парламенцкі дзённік

## *Працэдура ўсынаўлення дзяцей беларускімі сем'ямі не ўскладніцца*

**Учора дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі прынялі ў першым чытанні законапраект «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Грамадзянскі працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь па пытаннях усынаўлення (удачарэння) дзяцей, устанаўлення мацярынства».**

Як адзначыла намеснік міністра адукацыі Таццяна Кавалёва, законапраектам у Грамадзянскі працэсуальны кодэкс уводзіцца працэдура ўстанаўлення мацярынства на падставе рашэння суда. Судовая працэдура ўстанаўлення мацярынства неабходная для ўрэгулявання пытання адносна таго, хто з'яўляецца маці дзіцяці, калі яно было народжана сурагатнай маці, а таксама ўстанаўлення паходжання дзіцяці, калі яно было падкідышам або маці пакінула яго ў радзільным доме і паведаміла там недакладныя звесткі аб сабе.

Законапраект упершыню вызначае парадак усынаўлення дзяцей, якія з'яўляюцца замежнымі грамадзянамі або асобамі без грамадзянства і пражываюць на тэрыторыі нашай краіны. Пры іх усынаўленні неабходна падаць у суд пісьмовы дазвол міністра адукацыі. Устанаўліваецца таксама падсуднасць і парадак падачы заявы пры ўсынаўленні дзяцей у залежнасці ад грамадзянства і месца жыхарства дзіцяці і ўсынавіцеля. У прыватнасці, упершыню ўстаноўлена падсуднасць спраў па ўсынаўленню дзяцей, якія не з'яўляюцца грамадзянамі Беларусі. Такія справы будуць разглядацца абласнымі судамі, у Мінску — Мінскім гарадскім судом, а заявы ў суд будуць падавацца праз Нацыянальны цэнтр усынаўлення.

Праект закона таксама дапаўняе і ўдакладняе пералік дакументаў, неабходных для міжнароднага ўсынаўлення. Паводле слоў Таццяны Кавалёвай, у мэтах рэалізацыі права нашых грамадзян на ўсынаўленне беларускіх дзяцей, а таксама права родных на іх усынаўленне ў пералік дакументаў, якія неабходна падаць у суд для вырашэння пытання аб міжнародным усынаўленні дзіцяці, уключана заключэнне Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення аб адсутнасці сярод кандыдатаў ва ўсынавіцелі грамадзян Беларусі або сваякоў дзіцяці незалежна ад іх месца жыхарства. У заключэнні Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення будзе ўключацца інфармацыя аб даце пастаноўкі дзіцяці на цэнтралізаваны ўлік у Рэспубліканскім банку даных па ўсынаўленню. Такая інфармацыя будзе пацвярджаць, што дзіця не менш за год было даступнае для сямейнага ўладкавання ў нашай краіне. Удакладняецца і акт даследавання органамі апекі ўмоў жыцця ўсынавіцеляў. Так, гэты акт павінен утрымліваць інфармацыю аб тым, што дзеці ўсынавіцеля (уласныя або раней усыноўленыя) не мелі патрэбы ў дзяржаўнай абароне. У акт таксама будзе ўключацца інфармацыя аб адсутнасці ва ўсынавіцеля судзімасці за наўмысныя, цяжкія і асабліва цяжкія злачынствы незалежна ад таго, пагашана ці не судзімасць.

Паводле слоў намесніка міністра адукацыі, нормы законапраекта «не ўскладняюць працэдуру ўсынаўлення дзяцей беларускімі сем'ямі, нельга сказаць, што значна ўскладнена працэдура міжнароднага ўсынаўлення, проста ў ёй узмоцнена роля органаў апекі, рэгіянальных структур кіравання». У прыватнасці, працэс усынаўлення павінны стаць больш адкрытымі, найбольш аптымальнымі пры абароне інтарэсаў дзіцяці.

Адказваючы на пытанні дэпутатаў, Таццяна Кавалёва паведаміла, што ў 2006 годзе беларускія сем'і ўсынавілі 337 дзяцей. Яшчэ 39 дзяцей усынавілі замежныя грамадзяне. З іх 36 былі ўсыноўлены ў Італію на выніках шматгадовага аздараўлення там дзяцей, двое — сваякамі ў Швецыю, яшчэ адзін — сваякамі ў Расію. Дарэчы, на момант прыпынення ўсынаўлення дзяцей у Італію ў Цэнтры ўсынаўлення знаходзілася 145 спраў. Па ўсіх (за выключэннем станоўчага ўсынаўлення 36 дзяцей у мінулым годзе), адзначыла Таццяна Кавалёва, быў дадзены аргументаваны адказ: многім былі знойдзены беларускія сем'і, іншыя ўжо выраслі.

Таццяна Кавалёва таксама паведаміла, што апошнім часам актыўна развіваюцца іншыя формы ўладкавання дзяцей. Калі казаць аб сямейных формах уладкавання ў цэлым, то сёння з 32 тысяч дзяцей-сірот да 18 гадоў 23 176 дзяцей выхоўваецца ў сем'ях. З іх 11 577 — у апякунскіх сем'ях, 4733 — у прыёмных сем'ях, 461 — у дзіцячых дамах сямейнага тыпу, 326 — у дзіцячых вёсках, 6079 — у сем'ях усынавіцеляў.

**Сяргей КАРАЛЕВІЧ.**

# СЕМ ДЗЁН НАРАДЖЭННЯ

**Хто сказаў, што шматдзетная маці — вечна стомленая хатняя гаспадыня? Алена Лукашэвіч — паспяховы спецыяліст, цікавая жанчына, маці пяцярых дзяцей**

Алена Васільеўна нядаўна вярнулася з курсаў павышэння кваліфікацыі ў Мінску. Яна — урач вышэйшай катэгорыі, якую, як вядома, трэба перыядычна пацвярджаць. Пакуль мама вучылася ў сталіцы, з трыма малодшымі, з усёй хатняй гаспадаркай паспяхова справіўся галава сям'і. Аляксандр Гаўрылавіч, фармацэўт па спецыяльнасці, чалавек вельмі памяркоўны і разважлівы. Сведчаннем таму можа быць адзін факт, сведкай якога я стала: муж з жонкай нечакана заспрачаліся наконт мэтазгоднасці ўжывання вітамінаў працяглы час. Як чалавек, што мае справу з фармакалогіяй і пастаянна вывучае ўласцівасці лекавых прэпаратаў, Аляксандр Лукашэвіч лічыць, што вітаміны лепш піць пастаянна, асабліва ў асеннія і зімовыя месяцы. Доктар Алена Лукашэвіч прытрымліваецца меркавання, што вітамінымі прэпаратамі захапляцца не трэба. Найперш яны паказаны людзям, аслабленым хваробамі, пасля аперацыі, у шэрагу іншых выпадкаў. Дык вось, каб дастойна закончыць дыскусію, Аляксандр Гаўрылавіч павярнуў размову ў бяспройгрышны бок, загаварыў пра мэтазгоднасць індывідуальнага падыходу ў справе прызначэння прэпаратаў і неабходнасці павышанай дозы вітамінаў у тых выпадках, пра якія гаворыць жонка. Вось так дыпламатычна спрэчка была завершана. Усё ў яго менавіта такім чынам атрымліваецца: хутка, ненавязліва і грунтоўна.

Алена ўспомніла, як некалі свякроў ці то жартам, ці то ўсур'ёз сказала ёй: «З такім мужам, як твой, можна мець і пяцёра дзяцей». Тады яна не тое каб пакрыўдзілася, але ўнутры не пагадзілася з маці мужа. Новаспечаны ўрач на пачатку работы, пра якую марыла, да якой імкнулася, хацела дасягнуць пэўных поспехаў, можа, зрабіць кар'еру. Тым больш што яе амаль адразу паставілі загадчыцай тэрапеўтычнага аддзялення Антопальскай пасялковай бальніцы. Як маладым спецыялістам сям'і Лукашэвічаў выдзелілі дом. Адзін за адным нарадзіліся сыны Аляксандр і Віталь. Але маці заўсёды марыла мець дачушку. Усё часцей успаміналіся словы свекрыві, і з гадамі рабілася відавочнай іх справядлівасць. Аляксандр сапраўды быў падтрымкай і апорай ва ўсім. І яна нават не чакала, што ўсяго толькі нясмелае разважанне наконт таго, ці пацягнулі б яны траіх дзяцей, муж падтрымае і ва ўласцівай яму манеры разважыць і абгрунтуе так, што ў яе і сумненняў не застанецца. Карацей кажучы, Алег нарадзіўся і чаканым, і жаданым дзіцем. Ну і што, што не дзяўчынка! Значыць, лёс такі — мець трох сыноў. Тым больш што першыя вялікіх цяжкасцяў і клопатаў бацькам не прыносілі. Вучыліся заўсёды з цікавасцю, з ахвотай. Асаблівую схільнасць праяўлялі да матэматыкі і ўсіх дакладных навук.

Раслі дзеці. Бацькі нават адзін час падумвалі аб тым, як перабрацца ў райцэнтр. Работа для медыкаў знайшлася б у горадзе, і з жыллём нешта вымалёўвалася... Можа так у рэшце рэшт і адбылося б. Але аднойчы ў яе аддзяленні лячыўся святар. Алена Васільеўна любіла пагаварыць з гэтым вельмі інтэлігентным і надзвычай цікавым чалавекам. Яна лячыла яго цела, а ён нібы лекаваў яе душу. І неяк паступова той незвычайны пацыент падвёў свайго доктара да думкі аб неабходнасці вянчання.

Яны вянчаліся ў невялічкай вясковай царкве пасля дзесяцігоддзя сумеснага жыцця. Алена і зараз успамінае тую падзею як найвялікшае свята сваёй сям'і і сваёй душы. Каб расказаць, якое шчасце адчула ў тым старэнькім храме, не шкадуе самых узнёслых слоў.

У наступныя гады нарадзіліся дочкі Таццяна і Вольга. Так сталася. «Хіба маглі мы перашкодзіць паяўленню на свет дзяўчынак пасля вянчання?» — задае рытарычнае пытанне Алена. Тым больш што Бог паслаў ёй дачок, як хацела, памочніц. Таня зараз вучыцца ў трэцім класе, Волечка, усеагульная любіміца, толькі пайшла ў дзіцячы садок. Яна вельмі хуткая, рухавая, гэткая трохгадовая мастачка і натуралістка. Схільнасці да малявання юнай паненкі прыкметныя і на шпалерах, на фіранках, на яе любімай падушачцы. А вось жывую прыроду малодшая з Лукашэвічаў вывучае не толькі па адпаведнаму каналу «Бі-бі-сі». Два каты выдрэсіраваныя ёй уласнаручна так, што выконваюць любы капрыз гаспадыні. Калі яна ўнесла ў пакой за шкурку вялікага чорнага ката, мне зрабілася страшна. Але бацькі супакоілі: ён не падрапае і не пакусае дзіця, ён прывык. І сапраўды, магутны кацяра вісеў, як мяшок, у руках сваёй валадаркі, пакуль тая яго не адпусціла. Потым на змену таварышу прыйшоў белы кот і яго велікадушна пагладзілі. Каты, вядомая справа, лісліўыя жывёліны. Але цікава было назіраць, як лашчацца да дзяцей казляняты, акурат як тыя каты, труцца галовамі аб нагу. У гаспадарцы Лукашэвічаў ёсць каза і двое малых, якіх усе разам даглядаюць.

Гаспадарка ў сям'і невялікая: каза, свінка ды куры. Але падмога сямейнаму бюджэту з гэтай жыўнасці выходзіць добрая. Заадно і дзеці да працы прывучаюцца, пазнаюць, што адкуль бярэцца. Таня, старэйшая дачка, вучыцца ў трэцім класе. Захапляецца маляваннем, рознымі падзелкамі, аплікацыямі. Яе работамі завешана сцяна ў бацькоўскай спальні, бо свае творы Танечка найбольш любіць дарыць маме. Аляксандр Гаўрылавіч перакананы, што час, у які нараджаюцца дзеці, мае вельмі вялікі ўплыў на станаўленне іх асобы. Дачок ён называе прадстаўнікамі сучаснага камп'ютарна-інфармацыйнага пакалення. Сярэдні Алег таксама дзіця новай хвалі, ужо з камерцыйна-прагматычнымі схільнасцямі. Толькі вось яго любоў да чытання не ўпісваецца ў стэрэатып сучасных падлеткаў, якія «Вайну і мір» чытаюць па Інтэрнэту ў пераказе. Ён чытае запоем. Нават калі бацькі зробяць заўвагу, што час заняцца матэматыкай, васьмікласнік прызвычаіўся хаваць у падручнік мастацкі твор і пацішэньку чытаць любімы сюжэт. Гэта можна растлумачыць хіба толькі генамі. І дзед, і бабуля Алега працавалі настаўнікамі. Чытанне было сямейнай традыцыяй і ў доме Алены, і ў доме Аляксандра.

А ўжо старэйшыя сыны, якіх бацька называе яшчэ трошачкі савецкімі дзецьмі, дакладна пайшлі ў дзеда, настаўніка матэматыкі. Аляксандр займаецца на чацвёртым, Віталь на другім курсе факультэта прыкладной матэматыкі Белдзяржуніверсітэта. Старэйшы ўжо працуе ў вольны ад вучобы час праграмістам у адной фірме. Калі ён паступіў, расказаў бацька, то адчувалася адставанне выпускніка сельскай школы ад равеснікаў, якія скончылі сталічныя ліцэі, гімназіі, гадамі займаліся з рэпетытарамі. Але Саша Лукашэвіч сваім стараннем, сваёй працавітасцю ўжо ў першы год дагнаў аднакурснікаў. Такім чынам малодшаму брату было з каго браць прыклад. Цяпер хлопцы жывуць у адным пакоі інтэрната. І гэтым вельмі задаволена маці. Зручней перадаваць валізку з харчамі ў адзін адрас і быць спакойнай, што двое будуць негалодныя.

Вывучыць усіх, вызначыць у жыцці — зараз галоўная задача сям'і Лукашэвічаў. «Раней я мог з прыяцелямі пасля лазні-рыбалкі і за чаркай пасядзець, — смяецца Аляксандр Гаўрылавіч. — А цяпер не дазваляю сабе. Трэба ж здароўе добрае мець, каб усіх на ногі паставіць. Вось і стымул для тых, хто сумняваецца ў патрэбе вялікай сям'і».

Алена Васільеўна таксама лічыць, што сям'я не аднімае сілы, а наадварот служыць крыніцай энергіі і аптымізму. У іх доме ў пашане гумар і дапамога адно аднаму. Зноў варта ўспомніць свякроў з яе выразам: «Бог дасць дзяцей, дасць і сілы іх гадаваць». У дэкрэтным водпуску яна ніколі не была больш за паўгода. Наймала няньку, што даглядала дзіця да трох гадоў. А сама спяшалася на работу ў сваё аддзяленне, дзе чакалі хворыя. Раней у яе лячылася да 60 чалавек адначасова. Як у любой сельскай бальніцы, выпадала праводзіць рэанімацыю, аказваць экстранную дапамогу. Сельскі доктар — у поўным сэнсе «універсальны салдат». Работу сваю доктар Лукашэвіч заўсёды любіла. А калі апошнім часам Антопальская бальніца значна скарацілася, тут была адкрыта раённая бальніца сястрынскага догляду. Яе і ўзначаліла Алена Лукашэвіч, а ў сваім ранейшым аддзяленні яна засталася ўрачом-тэрапеўтам. Зараз яе галоўны клопат — 25 старых, нямоглых людзей, якія ў асноўным толькі зімуюць у бальніцы. Алена Васільеўна кажа, што такія ўстановы — вельмі гуманны і правільны падыход дзяржавы да праблемы састарэлых людзей. Іх, па сутнасці, ратуюць ад гібелі ў адзіноце і падаўжаюць жыццё. У бальніцы жывуць людзі або зусім бяздзетныя, або тыя, каго па нейкіх прычынах няма каму даглядаць. А большасць з гэтых старых усё жыццё сумленна працавалі на карысць дзяржавы. Вось дзяржава і аддае ім належнае.

— Нядаўна ў нас зроблены капітальны рамонт, — расказвае не без гонару загадчыца ўстановы сястрынскага догляду. — Пацыенты жывуць у цяпле, у чысціні, санітаркі, што працуюць круглыя суткі, уважлівыя. І гэта ўсё мой клопат. Я цэлымі днямі на рабоце. З хатняй гаспадаркай спраўляецца муж. А за адзін дадатковы выхадны, што даецца шматдзетнай маці, паспяваю разабрацца з уборкай, бялізнай, агародам, у горад з'ездзіць па справах, сама ваджу машыну. Вось так і жывём. Не сумуем. Сумаваць дакладна няма калі. Любімыя святы? Відаць, дні нараджэння. Іх усе адзначаем, абавязкова ўсе сем.



**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**
*Драгічынскі раён.*

## Паміж Беларуссю і Турцыяй даўно склаліся дружалюбныя адносіны

**Паміж парламентамі і дзяржаўнымі органамі Беларусі і Турцыі даўно склаліся цёплыя дружалюбныя адносіны, гэтаму ў многім садзейнічае работа паслоў. Аб гэтым заявіў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Канаплёў у Мінску на сустрэчы з дэпутатамі Вялікага Нацыянальнага сходу Турэцкай Рэспублікі.**

Ён адзначыў, што аб развіцці беларуска-турэцкіх адносінаў сведчыць тое, што «хутка ўжо будзе сто тысяч беларусаў, якія наведваюць здраўніцы Турцыі».

Турэцкая дэлегацыя знаходзіцца ў Беларусі па запрашэнню Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, дзе дэпутаты Вялікага Нацыянальнага сходу Турцыі будуць чытаць лекцыі. Уладзімір Канаплёў запэўніў турэцкіх гасцей, што дэпутаты ніжняй палаты беларускага парламента гатовы аказаць ім усебаковую дапамогу. «У сіле застаецца і запрашэнне Палаты прадстаўнікоў кіраўніку турэцкага Вялікага Нацыянальнага сходу наведаць Беларусь», — дадаў ён.

Спікер таксама падкрэсліў, што ўсе парламентарыі, якія прыязджаюць у Беларусь, каб азнаёміцца з сапраўдным становішчам спраў у краіне, могуць разлічваць на «поўную празрыстасць».

У сваю чаргу дэпутат Вялікага Нацыянальнага сходу Турэцкай Рэспублікі, савецнік прэм'ер-міністра Турцыі па міжнародных пытаннях Эгемен Баыш адзначыў, што прадстаўнікі Турцыі «вельмі рады знаходзіцца ў Беларусі». На яго думку, у адносінах паміж дзвюма краінамі «няма сур'ёзных цяжкасцяў», і Беларусь з'яўляецца краінай, «у якой найбольш спакойна можна жыць». «Нават тое, што сотні вашых студэнтаў вывучаюць турэцкую мову ў трох ВНУ — паказчык існуючай дружбы», — падкрэсліў ён.

**Марыя ГУЦАЛА, БЕЛТА.**

## ПАЛІВА... РАСЦЕ — І Ў ТРАКТАР!

На Віцебшчыне, у знакамітай гаспадарцы на Пастаўшчыне «Навасёлкі — Лучай», працуе трактар нямецкай вытворчасці на біяпаліве, што зрабілі на месцы. Менавіта тут вырабляюць рапсавы алей для паліва, а ён разы ў два таннейшы за звычайны. Як адзначыў падчас абмеркавання перспектыў развіцця сельскай гаспадаркі ў Прыдзвінскім краі старшыня Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Андрэйчанка, біядызельнае паліва ў бліжэйшыя гады можа забяспечыць палову патрэбнасці сельгасвытворцаў рэгіёна.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## БЕЛАРУСЬ — ПЕРУ

**Паводле вынікаў жараб'ёўкі плэй-оф Сусветнай групы Кубка Дэвіса, зборная Беларусі будзе спаборнічаць з камандай Перу на корце саперніка. Гульні пройдуць 21—23 верасня.**

**Ірына ПРЫМАК.**

Конкурсы

## Калі ты, чалавек, Чалавек...

**Сёлета пад эгідай Міжнароднага бюро Сусветнага паштовага Саюза (СПС) і ЮНЕСКО ў 36-ы раз праводзіцца эпісталярны конкурс. Гэта значыць, што мільёны маладых людзей (да 15 гадоў) з усіх куточкаў свету напішуць мільёны лістоў жыхарам планеты ад імя... дзікай жывёліны, якой пагражае небяспека з-за змяненняў у прыродных умовах і клімаце... І потым, тое ж бюро СПС, вызначыць, у каго гэта атрымалася лепш — на міжнародным узроўні.**

Днямі аўтарытэтнай камісіяй ў складзе намесніка генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Ірыны Саксонавай, галоўнага інспектара Міністэрства адукацыі Раісы Сідарэнка, прадстаўнікоў рэспубліканскіх СМІ падведзены вынікі Беларускага рэспубліканскага конкурсу. Гэта значыць, абрана сачыненне-ліст, які будзе прадстаўляць нашу краіну ў горадзе Берне (Швейцарыя).

Трэба зазначыць, што зрабіць гэта — выбраць лепшае — было досыць складана, бо ўсе работы кранала сваёй назіральнасцю, сваёй трывогай за будучыню, сваёй непасрэднасцю і шчырасцю. Лісты-звароты да людзей пісаліся гарадскімі дзецьмі і вясковымі, вучнямі выпускных класаў і пятых, ад імя мядзведзікаў і кажаноў, суслікаў і норак... З агульнай трывогай і просьбай да чалавека. «Не магу зразумець цябе, — пісала, напрыклад, маленькае Бабраня. — Калі ты самы моцны на Зямлі, значыць, ты павінен будаваць, а ты разбураеш. Калі ты самы дужы на Зямлі, значыць, павінен бараніць нас, слабых, а ты забіваеш. Калі ты самы справядлівы на Зямлі, значыць, павінен змагацца са злом, а ты яго заахвочваеш... Калі ты самы разумны на Зямлі, значыць, павінен прыносіць карысць... Калі ў цябе самае высакароднае сэрца, то чаму яно абыякавае да нас, маленькіх жывых істот?»

Над гэтымі пытаннямі, на агульную думку камісіі, варта падумаць усім насельнікам планеты. А сфармуляваў іх — Аляксей Гаўрылік, вучань 5-га класа Іллянскай сярэдняй школы Вілейскага раёна. Першае месца!

Шмат цікавых думак і высноў было ў аўтараў іншых работ. У выніку, разгледзеўшы ўсе, конкурсная камісія прыняла рашэнне прысудзіць трэцяе месца Юліі Каралеўскай, дзесяцікласніцы сталічнай гімназіі № 50; Настассі Дзямідавай, дзевяцікласніцы Карэбскай базавай школы Дрыбінскага раёна; Яўгеніі Зубрыцкай, сямікласніцы СШ № 1 г.п. Лёзна і Юліі Кацёл, дзевяцікласніцы раённага ліцэя г. Маларыта. Другое месца заваявалі работы Вольгі Нянашавай, пяцікласніцы Гомельскай гарадской шматпрофільнай гімназіі № 14 і Юліі Гурэцкай, шасцікласніцы Валеўскай сярэдняй школы, што на Навагрудчыне...

Усе пераможцы будуць узнагароджаны спецыяльнымі паштовымі сувенірамі ад РУП «Белпошта» і грашовымі прэміямі. Заахвочаны будуць і іх настаўнікі беларускай і рускай моў.

Вынікі ж міжнароднага конкурсу будуць аб'яўлены ў кастрычніку.

**Валянціна ДОЎНАР.**

## У БЕЛАРУСАЎ БУДЗЕ СВОЙ «ЛЯТАЛЬНЫ ТЭЛЕСКОП»

**Нягледзячы на страту спадарожніка «БелКА», касмічныя даследаванні ў нашай краіне працягваюць актыўна развівацца. У прыватнасці, вядуцца падрыхтоўчыя работы па стварэнню новага касмічнага апарата па дыстанцыйнаму зандзіраванню Зямлі.**

Паводле слоў старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Міхаіла Мясніковіча, пакуль канчаткова не вызначана, хто будзе будаваць касмічную платформу для новага апарата (сярод прэтэндэнтаў — расіяне, украінцы і кітайцы). Уся карысная нагрузка апарата будзе беларускай (і навуковыя распрацоўкі, і непасрэдна выраблене). Плануецца, што новы апарат стане мадэрнізаванай версіяй спадарожніка «БелКА», прыстасаванай не толькі пад расійскія комплексы кіравання, але і пад еўрапейскія сістэмы. Завяршэнне работ намечана на канец 2009 года. Мяркуецца, што новы апарат будзе адносна недарагі, бо пры яго стварэнні выкарыстаюць той задзел, які ўжо напрацаваны. Аднак беларускія навукоўцы не абмяжоўваюцца адным спадарожнікам. У іх планах — амбіцыйны праект па стварэнню бесплатформеннага апарата, так званага «лятальнага тэлескопа». Гэта будзе выхадам на прынцыпова новы ўзровень, падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч, аднак папярэдне трэба правесці адпаведныя навуковыя даследаванні і зрабіць фінансавыя падлікі.

Нацыянальная акадэмія навук ужо распрацавала Нацыянальную касмічную праграму даследаванняў, дзе вызначана асноўная стратэгія развіцця гэтай галіны ў нашай дзяржаве і яе прыярытэтныя накірункі. Яна скіравана на павышэнне канкурэнтаздольнасці беларускай эканомікі, за кошт таго, што суб'екты народнай гаспадаркі і органы дзяржкіравання, а таксама асобныя грамадзяне атрымаюць доступ да касмічнай інфармацыі і адпаведных паслуг. Важнымі задачамі такой праграмы, паводле слоў намесніка генеральнага дырэктара Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі Аляксандра Тузікава, з'яўляецца стварэнне новых спадарожнікаў і правядзенне даследаванняў па распрацоўцы адпаведных касмічных тэхналогій. А таксама стварэнне інфраструктуры — станцый прыёму інфармацыі са спадарожнікаў дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі і цэнтра кіравання спадарожнікамі. Акрамя таго, адным з ключавых момантаў праграмы з'яўляецца стварэнне навігацыйнага і топагеадэзічнага забеспячэння беларускіх карыстальнікаў адпаведнай інфармацыяй.

Важнае значэнне для Беларусі ў асваенні касмічнай тэматыкі з'яўляецца ўдзел у сумесных праграмах і праектах, напрыклад, другой праграмы Саюзнай дзяржавы «Космас СД», выкананне якой завяршаецца сёлета. Дзякуючы сумесным даследаванням, было атрымана шмат карыснай інфармацыі, адзначыў сп. Тузікаў. У Беларусі быў створаны цэнтр прыёму інфармацыі са спадарожнікаў дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі, устаноўлена адпаведная антэна. Сёння расіяне і беларусы вядуць сумесныя работы па стварэнню оптыкаэлектронных сродкаў для атрымання выяў Зямлі, прыбораў новага пакалення для вывучэння атмасферы, праводзяць фундаментальныя даследаванні па распрацоўцы новых рухавікоў плазменна-лазернага тыпу, якія дазволяць карэктаваць арбіту касмічных апаратаў. У рамках Саюзнай дзяржавы ідзе работа па выпрацоўцы канцэпцыі развіцця шматфункцыянальнай касмічнай сістэмы.

Не менш важнае значэнне для нашай краіны мае і інтэграцыя ў касмічныя даследаванні, якія праводзяцца Еўрапейскай супольнасцю, у прыватнасці, Еўрапейскім касмічным агенцтвам. Сёння яно налічвае 17 дзяржаў-удзельніц, прычым не ўсе яны з'яўляюцца членамі Еўрапейскага саюза. Для нашай дзяржавы далучэнне да гэтай арганізацыі дало б новыя магчымасці ў асваенні касмічнай тэматыкі.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ПОД СТРОИТЕЛЬСТВО АВТОЗАПРАВОЧНОЙ СТАНЦИИ**

| | |
|---|---|
| Месторасположение земельного участка | г. Жабинка, ул. Каменецкая |
| Кадастровый номер | 122550100002000233 |
| Целевое назначение | Для строительства и обслуживания многотопливной автозаправочной станции с комплексом сервисных услуг |
| Площадь участка, га | 0,7185 |
| Дата, время и место проведения | Открытый аукцион состоится в 15 ч. 00 мин. 14 мая 2007 года по адресу: г. Жабинка, ул. Кирова, 65, каб. 34 |
| Продавец объекта и организатор торгов | Жабинковский районный исполнительный комитет |
| Условия продажи | Возмещение убытков, причиненных изъятием участка, либо строительство весовой для ОАО «Жабинковская сельхозтехника», благоустройство прилегающей территории |
| Характеристика расположенных на участке строений, инженерных коммуникаций и сооружений | На участке расположена весовая. На прилегающей территории имеются водоснабжение, водоотведение, газоснабжение,электроснабжение, проходит линия электропередачи 10 кВ |
| Условия инженерного развития инфраструктуры | Вынос кабельной линии, благоустройство прилегающей территории согласно проектно-сметной документации |
| Расходы по организации и проведению аукциона, подлежащие возмещению | Стоимость технической документации и публикации извещения в СМИ |
| Начальная цена (руб.) | 51 427 500 |
| Сумма задатка (руб.) | 5 142 000 |
| Срок аренды | на 99 лет |

ПРИМЕЧАНИЕ:

Для участия в аукционе предоставляются:

1. Заявление по установленной форме.

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка.

Денежные средства вносятся на р/с 3604201610013 ОАО «Белагропромбанк», код банка 403, УНН 200038492, получатель платежа — Жабинковский райисполком.

3. Юридическими лицами — резидентами Республики Беларусь — доверенность, представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации.

4. Представителями физических лиц — резидентов Республики Беларусь — нотариально заверенную доверенность.

5. Юридическими лицами — нерезидентами Республики Беларусь — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

6. Юридическими и физическими лицами — нерезидентами Республики Беларусь — документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

7. Представителями юридических и физических лиц — нерезидентов Республики Беларусь — легализованную в установленном порядке доверенность.

8. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

9. Участник аукциона, выигравший торги:

— подписывает протокол аукциона в день проведения торгов;

— подписывает договор аренды объекта с продавцом в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола результатов аукциона.

10. Оплата стоимости объекта аукциона осуществляется по безналичному расчету в расчетных билетах Национального банка Республики Беларусь или в иностранной валюте по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на момент платежа.

Открытый аукцион будет считаться состоявшимся, если в нем приняло участие не менее двух участников.

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: 225101, г. Жабинка, ул. Кирова, 65, каб. 35, с 8.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний день приема документов 10 мая 2007 года.

Контактные телефоны в г. Жабинка:

по вопросам организации и проведения аукциона — (8-01641) 2-36-78;

по вопросам ознакомления с документацией, коммуникациями и осмотра в натуре земельного участка — (8-01641) 2-32-77.

## Сусветная турысцкая арганізацыя рэкамендуе Беларусі развіваць агратурызм

Упершыню ў Беларусь прыбыў з візітам Генеральны сакратар Сусветнай турысцкай арганізацыі Франчэска Франжыялі. Спадар Франжыялі наведаў турыстычны комплекс «Дудуткі», сустрэўся з Міністрам спорту і турызму Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Грыгаравым і іншымі афіцыйнымі асобамі нашай дзяржавы, прыняў удзел у адкрыцці кірмашу турыстычных паслуг «Адпачынак-2007», а таксама ў адкрыцці адукацыйнага семінара для вядучых беларускіх тур-аператараў «Турысцкі маркетынг і тэхніка рэкламы», які распрацавала Сусветная турысцкая арганізацыя.

Сусветная турысцкая арганізацыя з'яўляецца даччынай структурай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, яе роля ў сферы турызму параўнальная з роляй ЮНЕСКО ў галіне адукацыі і навукі. Два гады таму Беларусь далучылася да Сусветнай турыстычнай арганізацыі. Сёння ў яе складзе 150 дзяржаў.

Турызм — адна з асноўных крыніц сусветнай эканомікі. У 2005 годзе турысты, якія выехалі за мяжу, патрацілі больш за 5 млрд еўра. Такім чынам экспарт турыстычных паслуг заняў трэцяе месца пасля экспарту нафты і газу і апярэдзіў экспарт харчовых прадуктаў.

— Асноўнай задачай Сусветнай турысцкай арганізацыі з'яўляецца далучэнне яе членаў, асабліва новых, да сусветнага турыстычнага патоку з мэтай яшчэ большага яго развіцця, — сказаў на прэс-канферэнцыі спадар Франжыялі. — Мой прыезд у Беларусь азначае, што я хацеў бы аказаць садзеянне ўраду Беларусі, Міністэрству спорту і турызму ў правільнай ацэнцы сваіх магчымасцяў і найбольш рацыянальнаму і перспектыўнаму развіццю турыстычнай галіны. Другая мэта — умацаванне міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы турызму, Беларусь мае магчымасць вучыцца на памылках іншых краін і пераймаць лепшае.

Ядром турыстычнага прадукту Беларусі, лічыць спадар Франжыялі, з'яўляецца агра- і экатурызм. Для гэтага мы, на яго думку, маем спрыяльныя перадумовы: геаграфічнае становішча, прыроду, культуру, побыт, народ і яго гасціннасць.

Кіраўнік Сусветнай турысцкай арганізацыі даў тры рэкамендацыі адносна развіцця агра- і экатурызму. Першая — пра неабходнасць развіцця ўсёй інфраструктуры ў мясцінах, якія прымаюць гасцей, пачынаючы ад харчавання, пражывання, удзелу ў спартыўных і культурных мерапрыемствах. Маецца на ўвазе стварэнне цэлага комплексу турыстычных паслуг у вёсцы. Другая рэкамендацыя датычыцца выбіральнасці ў пошуку рэгіёнаў для агра- і экатурызму. Гэта значыць, не варта распыляцца па ўсёй краіне, а трэба вызначыць найбольш перспектыўныя раёны і сканцэнтраваць усе намаганні там. Аляксандр Грыгараў заўважыў, што такія рэгіёны ў нас ужо вызначаны — гэта Гродзенская, Віцебская і Мінская вобласці. Трэцяя рэкамендацыя датычыцца партнёрства і супрацоўніцтва на ўсіх узроўнях. Гэта значыць, патлумачыў спадар Франжыялі, не варта рабіць стаўку толькі на прыватны сектар, ён павінен знаходзіцца ў цесным супрацоўніцтве як з мясцовымі органамі самакіравання, так і з урадам краіны ў цэлым.

Генеральны сакратар Сусветнай турысцкай арганізацыі заўважыў, што ў свеце не маецца негатыўнага іміджу Беларусі, хутчэй, яго ўвогуле пакуль няма ніякага, бо еўрапейцы (менавіта яны складаюць асноўную частку сусветных турыстаў) пра Беларусь па-ранейшаму амаль нічога не ведаюць, нават — дзе яна знаходзіцца. Таму сённяшняя задача тых, хто працуе ў сферы турызму — з «нуля» стварыць станоўчы імідж гэтай цудоўнай і непаўторнай краіны.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## УРАЧОМ ПРАЦАВАЦЬ НЕПРЭСТЫЖНА?

**Павышэнне заработнай платы ўрачам, асабліва маладым спецыялістам, дапаможа вырашыць існуючую сёння праблему кадраў у галіне аховы здароўя.**

— Малады ўрач, які працуе ў паліклініцы, атрымлівае ў сярэднім 350—370 тысяч рублёў, а такая зарплата не вельмі прывабная, — адзначыў старшыня Камітэта аховы здароўя Мінгарвыканкама Дзмітрый Піневіч. Дэфіцыт кадраў у паліклініках горада, нягледзячы на прынятыя раней меры (40-працэнтную надбаўку да акладаў участковых урачоў і выдзяленне квот на будаўніцтва кватэр), існуе на працягу апошніх пяці гадоў. Сёння ўкамплектаванасць участковымі тэрапеўтамі ў дарослых паліклініках не перавышае 63 працэнтаў, а педыятрамі ў дзіцячых паліклініках — 70 працэнтаў. Адсюль праславутыя чэргі ля кабінетаў і незадаволенасць гараджан якасцю аказання медыцынскай дапамогі. Праблему ўзмацняе яшчэ адзін факт: у паліклініках каля 20 працэнтаў урачоў — пенсійнага ўзросту.

**Вольга ГРЫГОР'ЕВА, «Мінск—Навіны».**

**ОАО «МАЛЬВА»**
**АДРЕС: Г. МИНСК, УЛ. КОРЖА, 11**
**ИЗВЕЩАЕТ АКЦИОНЕРОВ**
**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ С 1 ЯНВАРЯ 2006 г. ПО 31 ДЕКАБРЯ 2006 г.**

| Наименование показателей | Код стр. | За отчетный период в млн. руб. |
|---|---|---|
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 4033 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 040 | 2997 |
| Расходы на реализацию | 060 | 1022 |
| Прибыль (убыток) от реализации | 070 | 14 |
| Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов | 130 | 19 |
| Итого прибыль (убыток) за отчетный период | 200 | 33 |
| Налоги и сборы, платежи и расходы, производимые из прибыли | 210 | 16 |

## «ПРЭМІЯ ІМЯ АКАДЭМІКА ВАЦЛАВА ЛАСТОЎСКАГА ДЛЯ БЕЛАРУСКАМОЎНЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ ВНУ БЕЛАРУСІ»

З мэтай маральнай падтрымкі беларускамоўных выкладчыкаў вышэйшай школы, стымулявання выкладання па-беларуску, разумеючы акалічнасць, што падтрымка беларускасці ёсць не толькі падтрымка беларускай самаідэнтычнасці, але і ўнёсак у культурную разнастайнасць у свеце, Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Таварыства беларускай школы» (ТБШ) пры падтрымцы іншых недзяржаўных арганізацый і дзеячаў культуры і навукі засноўваюць тры штогадовыя прэміі імя акадэміка Вацлава Ластоўскага для выкладчыкаў і прафесараў беларускіх ВНУ.

Для ўдзелу ў праекце неабходна запоўніць адпаведную анкету і даслаць да 15 мая 2007 г. на адрас электроннай пошты **Lastouski@qmail.com, або 220029 Мінск, а/с 64.**

Прэміяльны камітэт з ліку вядомых дзеячаў навукі і культуры вызначыць да 30 чэрвеня 2007 г. лаўрэатаў конкурсу і ўручыць спецыяльныя дыпломы, рэкамендацыі да друку дапаможнікаў.

**Дадатковую інфармацыю аб праекце (анкеце) можна атрымаць на старонцы ў Інтэрнэце http://nastaunik.info/Lastouski ці па тэлефоне 029-752-08-21.**

**Утерянный страховой полис** по обязательному страхованию гражданской ответственности транспортных средств на территории РБ **филиала СООО «Белкоопстрах»** в г. Гомеле **серии АД № 5084464** считать **недействительным**.

Утерянное **удостоверение инвалида III группы № 0016788** на имя **Пинчук И.К.** считать **недействительным**.

Згублены **дыплом, выдадзены Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэтам** на імя **С.М. Саленіковіч,** лічыць **несапраўдным**.

Утерянную **квитанцию** 1-СУ о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) **№ 5754965 серии ГС** филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Гомеле считать **недействительной**.

Шайбу, шайбу!

# Гуляць, каб перамагаць

**Нацыянальная зборная Беларусі па хакею перамагла ў першым з шасці таварыскіх матчаў перад чэмпіянатам свету-2007 каманду Славеніі — 5:2. Цікава, што да сярэдзіны трэцяга перыяду сустрэчы ў Любляне нашы ігракі ўступалі гаспадарам (0:2).**

Выйграць падначаленым Курта Фрэйзера дапамаглі дакладныя кідкі Сяргея Яркoвіча, Аляксея Угарава, Сяргея Задзялёнава (ён вызначыўся двойчы) і Андрэя Глебава. Наздарма галоўны трэнер нашай зборнай зрабіў дэвізам словы «Гуляць, каб перамагаць». 12 і 14 красавіка беларусы памераюцца сіламі з італьянцамі ў гасцях.

**Ірына ПРЫМАК.**

## Гульня № 1

### З ІГРАКА — У ТРЭНЕРЫ

**Не прайшло і паўгода, як галоўнага трэнера сталічнага «Дынама», 34-гадовага Пятра Качуру, змяніў 33-гадовы Аляксандр Хацкевіч. Новы настаўнік стаў 16-м важаком мінчан за 7 апошніх гадоў (для параўнання ў барысаўскім БАТЭ была змена трэнера толькі адна — у 2005-м). У якасці прычыны адстаўкі Качуры названа паражэнне гродзенскаму «Нёману» ў чвэрцьфінале Кубка Беларусі, на родным стадыёне 5 красавіка.**

Новы настаўнік «бела-блакітных» двойчы прызнаваўся лепшым футбалістам Беларусі (1998, 2000), выступаў за мінскае і кіеўскае «Дынама» і нацыянальную зборную Беларусі. Гэты сезон Хацкевіч пачынаў у якасці ігрока. Дапамагаць новаму галоўнаму трэнеру будуць асістэнты — Юрый Пышнік (старшы трэнер) і Аляксандр Лухвіч (трэнер). Дарэчы, своеасаблівая змена трэнера адбылася ў штабе чэмпіянаў краіны: галоўны настаўнік БАТЭ Ігар Крыўшэнка зараз знаходзіцца ў бальніцы з інфарктам міякарда (трэнер адчуў сябе дрэнна за рулём на дарозе з Барысава ў Мінск 7 красавіка), таму кіраваць камандай пакуль будзе старшы трэнер Віктар Ганчарэнка. Жадаем Ігару Крыўшэнку выздараўлення, а Аляксандру Хацкевічу — поспеху ў яго першых кроках на слізкай трэнерскай дарожцы мінскага «Дынама».

### БЕЛАРУСЫ АДБІРАЮЦЬ АЧКІ Ў «АРСЕНАЛА»

Беларуская федэрацыя футбола паўторна накіравала ў ФІФА дакументы, у якіх патрабуе зняць ачкі з лонданскага «Арсенала» ў чэмпіянаце Англіі, бо клуб два гады адхіляецца ад выплаты кампенсацыі (350 тысяч еўра) СДЗЮШАР мінскага «Дынама», дзе пабіў першыя крокі Аляксандр Глеб. Грошы павінны пайсці на абсталяванне новага поля для юных выхаванцаў «Дынама»: дзеці дасюль трэніруюцца на асфальце. Нагадаю, што паўабаронца перайшоў у англійскі клуб летам 2005 года з нямецкага «Штутгарта».

### «ЧЫРВОНЫЯ Д'ЯБЛЫ» ЎЧЫНІЛІ РАЗГРОМ

Пасля паражэння (1:2) у першай чвэрцьфінальнай сустрэчы ў Лізе чэмпіёнаў ад італьянскай «Ромы» англійскі «Манчэстэр Юнайтэд» прадэманстраваў неверагодную сілу волі ў матчы ў адказ на сваім полі — 7:1.



*Ігракі «Ромы» не чакалі такога прыёму ад манкуніянцаў.*

Каманда Алекса Фергюсана ўпершыню стала пераможцай двухматчавага процістаяння ў самым ганаровым еўрапейскім клубным турніры пасля пройгрышу ў першай гульні. «Рома» не хутка ачуняе пасля такога разгрому ад «чырвоных д'яблаў». У паўфінал Лігі чэмпіёнаў таксама прабіўся яшчэ адзін англійскі клуб — лонданскі «Чэлсі», які выйграў у гасцях у іспанскай «Валенсіі» — 2:1 (вынік першага чвэрцьфінальнага матча 1:1). Цікава, што перамогу «арыстакратам» прынёс гол на апошняй хвіліне асноўнага часу.

### ЗМЯНІЎ ЗБОРНУЮ НА КЛУБ

Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Балгарыі Хрыста Стоічкаў планаваў узяць у матчах з беларусамі 6 ачкоў (адборачныя сустрэчы чэмпіянату Еўропы-2008 паміж нашымі камандамі адбудуцца 2 і 6 чэрвеня), але ўжо не зможа гэтага зрабіць, бо падаў у адстаўку і ўзначаліў іспанскую «Сельту». Імя новага настаўніка стане вядома 25 красавіка. Пакуль сапернік нацыянальнай зборнай Беларусі займае трэцяе месца ў групе з 9 ачкамі. Змена трэнера можа адмоўна паўплываць на стан ігракоў.

### ЧЭМПІЁН «НА КАНІ» І ПРЫ АДСУТНАСЦІ ТРЭНЕРА

Дзеючы ўладальнік Кубка і чэмпіён Беларусі па футболу, барысаўскі БАТЭ, зрабіў крок да выхаду ў фінал розыгрышу Кубка краіны. Днямі каманда Ігара Крыўшэнкі перамагла ў гасцях «Мінск» (1:0). Калі барысаўчане задаволіліся мінімальным лікам гульні, то брэсцкае «Дынама» і гродзенскі «Нёман» забілі адзін аднаму ў сустрэчы ў горадзе над Бугам па два мячы — 2:2.

**Ірына ПРЫМАК.**



МЕРКАВАННІ...

*Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.*

г. Лагойск.

## Дарожная драма ў велікодную ноч

**Калі інспектары батальёна дарожна-патрульнай службы ДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама ў велікодную ноч забяспечвалі бяспеку руху на скрыжаванні вуліц Пушкіна і Астроўскага, да іх пад'ехала «Пежо». Яе вадзіцель расказаў, што на вуліцы Дзяржынскага ў слуп урэзалася «Альфа Рамэа».**

Ва ўказаным месцы супрацоўнікі ДАІ ўбачылі разбіты аўтамабіль — ён не ўпісаўся ў паварот. 26-гадовы вадзіцель і 23-гадовы пасажыр мелі патрэбу ў неадкладнай медыцынскай дапамозе. Пакуль адзін інспектар для абазначэння і абгароджвання месца ДТЗ расстаўляў на асфальце святлоадбівальныя конусы, другі выклікаў «хуткую» і выратавальнікаў. Патрульны «Мерседэс» інспектара паставілі да добра асветленым участку за пашкоджаным аўтамабілем.

Пасля таго як супрацоўнікі МНС разрэзалі «Альфа Рамэа» і выцягнулі з яе заціснутага пасажыра, апошняга і вадзіцеля машына хуткай дапамогі адвезла ў бальніцу. Інспектары засталіся ахоўваць месца ДТЗ і чакалі прыезду следча-аператыўнай групы. І тут увагу прыцягнула машына, якая рухалася ў іх бок. Вельмі хутка стала зразумела, што яна едзе прама на «Альфа Рамэа». Пададзены жазлом сігнал аб спыненні быў праігнараваны. Калі б інспектары не адскочылі ўбок, «Мазда», якая рухалася з яўным перавышэннем хуткасці, змяла б іх са свайго шляху. Такая ж доля магла б спасцігнуць міліцыянераў з дэпартамента аховы, службовая «Ніва» якіх стаяла за «Мерседэсам». А так «Мазда» стукнулася ў «Альфа Рамэа» і страціла кіраванне. Змяніўшы траекторыю руху, яна апынулася на левым баку вуліцы і стала пад вуглом да краю праезнай часткі. Зрушаная з месца «Альфа Рамэа» ўрэзалася ў «Мерседэс», а той — у «Ніву». Дваццаціпяцігадовага вадзіцеля «Мазды» давялося шпіталізаваць. За гэты ўчынак яму давядзецца адказваць. Лава падсудных чакае таксама і вадзіцеля «Альфа Рамэа». У маі 2005 года пасля кіравання транспартным сродкам у нецвярозым стане ён быў пазбаўлены правоў. Нягледзячы на гэта ён працягваў ездзіць за рулём і мінулым летам за адзін месяц пяць разоў затрымліваўся супрацоўнікамі ДАІ. У якім стане ён знаходзіўся гэтым разам, установіць экспертыза. Тым часам, забяспечваючы бяспеку грамадзян у святочны дзень, вартавыя дарожнага парадку Гродзеншчыны затрымалі 36 нецвярозых вадзіцеляў.

**Сяргей РУДНІК,**
**начальнік упраўлення ДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

### СЛУЖЫЎ У ЦАРКВЕ. ТУТ І КРАЎ

Размова пойдзе пра 23-гадовага дзяжурнага Тураўска-Мазырскай епархіі, які, мяркуючы па яго паводзінах, вырашыў трохі разбагацець. З гэтай мэтай ён украў у бухгалтэрыі Свята-кафедральнага сабора, калі там нікога не было, 320 тысяч рублёў. Сума гэта яго не задаволіла, і ён «паўтарыў набег» на той жа самы кабінет, дзе для яго былі падрыхтаваны 370 тысяч. На гэты раз царкоўнага зладзюжку вывелі на чыстую ваду.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

Супраць наркотыкаў

## Свята «пад кайфам»

**Упраўленне па наркакантролю і процідзеянню гандлю людзьмі УУС Магілёўскага аблвыканкама паведаміла пра вынікі аперацыі, якая была праведзена ў пачатку красавіка.**

У гэты дзень у кафэ «Метро» дзень нараджэння адзначалі больш за паўсотню гасцей, сярод якіх было шмат жыхароў Гомеля і Жлобіна. Для праверкі аператыўнай інфармацыі, пры згодзе адміністрацыі кафэ, на свята а 6-й гадзіне раніцы завіталі супрацоўнікі міліцыі, узмоцненыя сіламі спецыяльнага падраздзялення.

Урач-нарколаг пасля знешняга агляду адразу адправіў на экспертызу ў наркалагічны дыспансэр 27 чалавек. У асноўным гэта маладыя людзі, узростам да 25 гадоў. У іх крыві былі псіхатропныя рэчывы. У людзей былі знойдзены амфітамін, марыхуана, гашыш, МДМА. На падлозе супрацоўнікі міліцыі сабралі каля 2 грамаў амфітаміну (гэта даволі шмат): пакецікі з наркотыкамі госці паспешліва павыкідалі. Паводле вынікаў аперацыі, сем чалавек былі затрыманы. А цяпер стала вядома, што трое з іх ужо арыштаваныя: гэта жыхар Гомеля, у якога ў аўтамабілі знайшлі 1 грам гашышу і два магіляўчаніны. Яны падазраюцца ў захоўванні наркатычных сродкаў. Адзін з магіляўчан, дарэчы, працаваў бармэнам у кафэ «Метро».

**Алена КАЗЛОВА.**

**ИНФОРМАЦИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ФИНАНСОВО-ХОЗЯЙСТВЕННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ» ЗА 2006 ГОД**

| № строки | Наименование показателей | Единица измерения | С начала года |
|---|---|---|---|
| 1. | Выручка от реализации товаров, продукции, работ и услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) | млн. рублей | 51015 |
| 2. | Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг; управленческие расходы, расходы на реализацию | млн. рублей | 49549 |
| 2.1. | Из них — на оплату труда | млн. рублей | 12483 |
| 3. | Прибыль (убыток) за отчетный период, всего | млн. рублей | 1795 |
| | в том числе: | | |
| 3.1. | прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг | | 1466 |
| 3.2. | прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов | | 361 |
| 3.3. | прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов | | -32 |
| 4. | Налоги и сборы, платежи и расходы, производимые из прибыли | млн. рублей | 686 |
| 5. | Просроченная долгосрочная дебиторская задолженность | млн. рублей | — |
| 6. | Просроченная долгосрочная кредиторская задолженность | млн. рублей | — |
| 7. | Нераспределенная прибыль | млн. рублей | 1109 |
| 8. | Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн. рублей | 55 |
| 9. | Дивиденды на одну акцию | рублей | 31 |
| 10. | Количество акционеров, всего | лиц | 2845 |
| | в том числе: | | |
| 10.1. | юридических лиц | лиц | 2 |
| 10.2. | физических лиц | лиц | 2843 |
| 11. | Среднесписочная численность работающих | человек | 1215 |
| 12. | Обеспеченность акции имуществом общества | тысяч рублей | 11,4 |

Акционеры — физические лица могут получить дивиденды за 2006 год с 14 мая по 15 июня 2007 года в установленном порядке в депозитарии ООО «Лидеринвест» из расчета 26,35 рубля на одну акцию (за вычетом налога на доходы).

**Справки по тел. 252-14-43. ООО «Лидеринвест» — 285-25-57, 285-37-43.**

Твае правы

## ГРУПА — ЯШЧЭ НЕ ЗВАЛЬНЕННЕ

**Статыстыка сведчыць, што зараз у Беларусі налічваецца каля 509 тыс. інвалідаў, прычым значная іх частка яшчэ знаходзіцца ў працаздольным узросце і мае намер працаваць. Між тым, якраз тут узнікае некалькі па-сапраўднаму «цяжкіх» пытанняў. Пры якіх умовах даецца «згода» на працу чалавека «на групе», ці абавязаны наймальнік прадаставіць яму больш «лёгкае» месца, а таксама які павінен быць рэжым работы і адпачынку інваліда? Аб усім гэтым і іншым — наша сённяшняя гутарка з загадчыкам юрыдычнай кансультацыі галоўнага прававога ўпраўлення апарату Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Уладзімірам Іванавічам ШЭЛКОВІЧАМ.**

### РАШЭННЕ МЕДЫКАЎ — ГАЛОЎНАЕ

Першая і галоўная ўмова для працы чалавека на групе — наяўнасць адпаведных медыцынскіх рэкамендацый. Прычым у тых жа рэкамендацыях медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі ў любым выпадку вызначаецца, якія канкрэтна віды работ магчымыя ў сувязі з частковай стратай здароўя. І ў рэшце рэшт, менавіта ад гэтага залежыць, можа той ці іншы інвалід заставацца на сваім ранейшым месцы або не.

Так, інваліды, якія па заключэнню МРЭК прызнаюцца непрацаздольнымі, у прыватнасці, інваліды, стан здароўя якіх перашкаджае выкананню ранейшых прафесійных абавязкаў або ўяўляе патэнцыяльную пагрозу здароўю і бяспецы іншых людзей, могуць быць звольнены. Аднак адначасова яны павінны атрымаць выхадную дапамогу як мінімум у памеры 2-тыднёвага сярэдняга заробку — пры гэтым у калектыўным дагаворы канкрэтнай арганізацыі можа прадугледжвацца і больш значная сума.

— Асобная гаворка аб інвалідах, якія па заключэнню МРЭК не страцілі працаздольнасці, — адзначае Уладзімір Шэлковіч. — Варта падкрэсліць, што сам па сабе факт атрымання групы падстаў для звальнення не дае. Але тут могуць узнікнуць пэўныя нюансы. Скажам, чалавеку рэкамендаваны перавод на больш лёгкую працу. У той жа час, у сувязі з ніжэйшай зарплатай, інвалід не дае на такі перавод сваёй згоды. Або згода ёсць, а вось «патрэбнага» па рэкамендацыях месца ў наймальніка — няма. У такіх варунках магчыма звальненне па другому пункту 42-га артыкула Працоўнага кодэкса — з прычыны неадпаведнасці пасадзе па стану здароўя.

Адно, што ў выпадку інваліднасці ў выніку працоўнага знявечання ці прафесійнага захворвання стварэнне «патрэбнага» месца — задача наймальніка. І яшчэ адзін момант. Як зазначае Уладзімір Шэлковіч, незалежна ад звальнення ці працягу работы кожны чалавек на «групе» мае права на атрыманне пенсіі па інваліднасці. Прычым якіх-небудзь асаблівасцяў у абмежаванні выплат тут няма.

### ВЫПРАБАВАЛЬНЫ ТЭРМІН НЕМАГЧЫМЫ

Як вядома, інваліднасць вызначаецца толькі на пэўны час. Таму цалкам верагодна, што пасля чарговага медыцынскага пераасведчання групу проста «здымуць». Разам з тым, заўважае Уладзімір Шэлковіч, якіх-небудзь гарантый па вяртанню гэтага чалавека на яго ранейшае месца ў нашым заканадаўстве няма.

Затое выпадае казаць аб іншых дадатковых правах. Да прыкладу, ёсць строгая норма — пры прыёме на работу інваліду немагчыма ўстанавіць выпрабавальны тэрмін.

— Апроч таго, можна ўзгадаць, што, паводле 45-га артыкула Працоўнага кодэкса, пры ўмове роўнай кваліфікацыі і вытворчасці працы інваліды маюць перавагі пры захаванні свайго месца падчас скарачэння колькасці работнікаў любых арганізацый, — працягвае Уладзімір Шэлковіч. — А, паводле 287-га артыкула Працоўнага кодэкса, калі скарачэнне праводзіцца ў спецыялізаваных арганізацыях, дзе выкарыстоўваецца праца інвалідаў, то людзі «на групе» ў параўнанні са сваімі здаровымі калегамі маюць пераважнае права застацца на сваім месцы нават незалежна ад паказчыкаў вытворчасці працы і кваліфікацыі.

### СКАРОЧАНЫ. АБО НЯПОЎНЫ?

Таксама адметны момант — асаблівы рэжым работы. У дадзеным выпадку заканадаўства вызначае наступнае. Інвалідам І і ІІ груп наймальнік абавязаны вызначыць скарочаную працягласць працоўнага часу. У прыватнасці, ён не павінен перавышаць 35 гадзін у тыдзень, а таксама 7 гадзін — у дзень. Што да інвалідаў ІІІ групы, то пры наяўнасці медыцынскіх рэкамендацый яны карыстаюцца правам на няпоўны працоўны дзень. Дарэчы, такое ж рашэнне можа быць прынята ў адносінах да інвалідаў І і ІІ груп — у дадатак да таго, што ім вызначана скарочаная працягласць працоўнага часу.

— Варта мець на ўвазе, што пры скарочанай працягласці працоўнага часу аплата працы інвалідаў І і ІІ груп праводзіцца як пры поўнай, 40-гадзіннай норме, — тлумачыць Уладзімір Шэлковіч. — Аднак калі інваліду вызначаны рэжым няпоўнага працоўнага часу, то аплата робіцца ўжо толькі за фактычна адпрацаваны час.

### ЗГОДА ПЛЮС ДАЗВОЛ

Працоўны кодэкс вызначае, што інваліды могуць прыцягвацца да звышурочных работ толькі з іх асабістай згоды. І толькі тады, калі гэтыя звышурочныя работы не забараняюцца медыцынскім заключэннем. Выключна на такіх жа ўмовах (згода плюс дазвол) магчыма работа інвалідаў у начную змену, па выхадных і святочных днях.

Тут жа нялішне заўважыць, што тая ж асабістая згода з'яўляецца абавязковай і ў выпадку накіравання работніка-інваліда ў службовую камандзіроўку. Прычым падобныя правілы «працуюць» незалежна ад групы.

### ЗА «СВОЙ КОШТ». АЛЕ З ДАМОВАЙ

Мінімальная працягласць працоўнага водпуску ў нашай краіне складае 21 каляндарны дзень. Аднак пры гэтым асноўны падоўжаны водпуск работніка-інваліда вызначаны ў 30 каляндарных дзён. Зрэшты, таксама не сакрэт — нават гэтай «прывілеі» часам бывае недастаткова. І галоўным чынам з-за неабходнасці надаваць нашмат больш часу свайму здароўю.

— У дадзеным выпадку наша заканадаўства прадугледжвае шэраг дадатковых магчымасцяў для асобных катэгорый інвалідаў, — заўважае Уладзімір Шэлковіч. — Так, артыкул 189 Працоўнага кодэкса кажа, што інвалідам, якія занятыя на вытворчасцях, у цэхах і ўчастках, якія спецыяльна прызначаны для гэтай катэгорыі грамадзян, а таксама інвалідам, якія працуюць у вучэбна-вытворчых арганізацыях таварыства глухіх, пры жаданні наймальнік абавязаны прадастаўляць водпуск без захавання зарплаты працягласцю 60 каляндарных дзён. Праўда, ніякіх умоў па часу выкарыстання «адпачынкаў за свой кошт» у заканадаўстве няма. Адпаведна, наконт канкрэтных тэрмінаў выхаду ў такі адпачынак неабходна дамаўляцца з наймальнікам.

**Сяргей ГРЫБ.**

*«Цякла тут з лесу невялічка*
*Травой зарослая крынічка».*
**Якуб КОЛАС.**

# Крынічка

*Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285-88-81*

№ 11 (229)

## Чым напоўніць пасадачныя ямы

У ямы пад яблыні і грушы насыпаюць на выбар: 3—4 вядры перапрэлага гною, 4—5 вёдзер кампосту, 2—4 вядры перагною або 6—10 вёдзер торфу. Але ва ўсіх выпадках арганічнае ўгнаенне павінна быць адно. Да яго дадаюць 2,5—3 шклянкі суперфасфату.

Для слівы, вішні, абляпіхі і чорнай рабіны у арганікі кладуць у ямы на выбар: 1,5—2 вядры перагною, 2—3 вядры кампосту, 3—4 вядры торфу ці 1,5—2 вядры перапрэлага гною. Сюды дадаецца 1—1,5 шклянкі суперфасфату. Для парэчак, агрэсту і бружаніцы (жымолосці) — 1 вядро перапрэлага гною або 1—2 вядры кампосту, або 1 вядро перагною, або 2 вядры торфу.

На палосках, якія адводзяцца пад маліну і ажыну, на кожны метр радка паўметровай шырыні ўносяць па 1—2 вядры арганікі і паўшклянкі суперфасфату і хлорыстага калію. Такое ж угнаенне ўносяць і пад суніцы. Пад абляпіху на глінiстых і суглінiстых глебах пры пасадцы ў пасадачныя ямы абавязкова дадаюць 2 вядры пяску. Падрыхтоўку пасадачных ям заканчваюць за 7—10 дзён да пасадкі пладова-ягадных саджанцаў.

## Дачныя падказкі

❐ Часнок і цыбуля, высаджаныя невялікімі групкамі сярод кустоў парэчкі і пакінутыя на зіму, засцерагаюць іх ад пупышкавага кляшча.

❐ Шкоднай тлі на ўчастку будзе менш, калі паміж раслінамі высадзіць ці паставіць гаршкі са звычайнай пакаёвай геранню.

❐ Калі высаджваць пад кроны яблынь настурку, крывяной тлі будзе менш.

## Каб паскорыць пачатак цвіцення

**Цыбульныя культуры — цюльпаны, нарцысы, гіяцынты — зацвітуць раней, калі ў канцы сакавіка—пачатку красавіка зняць з градак зімнія ўкрыцці, устанавіць каркасы і нацягнуць на іх поліэтыленавую плёнку. Каркасы могуць быць рознай канструкцыі, але чым яны вышэй, тым большы аб'ём паветра будзе пад плёнкай і тым меншая небяспека перагрэву раслін у сонечныя дні і пераахаладжэння ў марозныя ночы.**

Пачатак цвіцення гладыёлусаў можна паскорыць на 10—12 дзён, калі папярэдне прарошчваць пупышкі клубнецыбулін у памяшканні пры тэмпературы 22—27 градусаў і вільготнасці паветра 60 працэнтаў на працягу 40—45 дзён. Прарошчванне праводзяць сухім спосабам, не кладучы іх у глебу, а раскладваючы ў адзін слой у каробкі, а калі парасткі паяўляюцца, ставяць бліжэй да акна, але на сонца. Чым вышэй тэмпература ў памяшканні, тым менш часу спатрэбіцца для прарошчвання клубнецыбулін. Ваганні вільготнасці тэмпературы паветра проціпаказаны. Калі яна вышэй 60 працэнтаў, пачнуць расці карэньчыкі, якія пры пасадцы будуць пашкоджаны. Пры больш нізкай вільготнасці высахнуць самі клубнецыбуліны.

Паскарае пачатак цвіцення пасадка клубнецыбулін пад часовыя плёначныя ўкрыцці. Рана вясной накрываюць градкі плёнкай для больш ранняга прагрэву глебы, што дазваляе высаджваць клубнецыбуліны на 15—20 дзён раней. Калі прымяніць абодва прыёмы, гладыёлусы могуць вас парадаваць сваім цвіценнем ужо ў канцы чэрвеня. Цвіценне півоняў і лілій можна паскорыць, калі ўзвесці над імі таксама плёначныя ўкрыцці.

## Калючы кветнік

**Даўней нашы бабулі садзілі пры ўваходзе на ўчастак ці на агарод, а то і перад домам калючыя расліны. Традыцыя бярэ пачатак з часоў паганства — нашы продкі верылі, быццам калючы куст адпуджвае ведзьмароў і засцерагае ад сурокаў.**



З аднагадовых раслін можна пасадзіць **расторопшу белаплямістую**. У яе прыгожыя калючыя цёмна-зялёныя лісцікі з выразным белым мармуровым малюнкам. Прыгожыя і суквецці, падобныя на карзінкі чартапалоху. Непатрабавальная шматгадовая расліна **мардовік звычайны**. Гэта расліна вышынёй ад 0,5 да 2 м з калючым сцяблом, моцна апушанымі лісцямі. Шматкветкавыя суквецці сабраныя ў круглыя галоўкі дыяметрам 5—8 см, часцей блакітнай ці пурпуровай афарбоўкі, з моцным пахам мяты. Да глебы мардовік непатрабавальны, зімастойкі, а вось залішняя сырасць часта бывае прычынай гібелі гэтай расліны. Яшчэ адна калючка — шматгадовы **сінегаловік *(на фота)***. Расліна да 70 см вышынёй з калючымі лісцямі. Сінія кветкі сабраныя ў суквецці, акружаныя разеткай калючазубчастых прыкветнікаў. Сінегаловік любіць сонца і рыхлую глебу, якая змяшчае вапну.

## Хто ў садзе піліць

Яблыневы, грушавы і чорны слівовы пільшчыкі з'яўляюцца манафагамі, гэта значыць пашкоджваюць дрэвы аднаго батанічнага роду. Жоўты слівовы пільшчык — алігафаг харчуецца некалькімі відамі раслін з аднаго сямейства. Такім чынам, яблыневы пладовы пільшчык пашкоджвае толькі яблыню, грушавы — грушу, чорны слівовы — сліву, а жоўты слівовы — сліву, алычу, вішню і іншыя костачкавыя культуры. Знешне дарослыя насякомыя крыху нагадваюць асу. Яблыневы і грушавы пільшчыкі па знешніх прыкметах вельмі падобныя. Верх дарослых насякомых бурага, ніз — жоўтага колеру. Толькі галава ў яблыневага пільшчыка бура-жоўтага колеру, а ў грушавага — чырванаватага. Чорны слівовы пільшчык мае бліскуча-чорнае цела з жоўтымі нагамі, а жоўты — жоўта-бурага колеру з цёмна-жоўтымі крыламі.

Зімуюць шкоднікі ў стадыі лічынкі ў зямлі на глыбіні ад 5 да 20 см. У лёгкіх, рыхлых глебах лічынкі зімуюць на большай глыбіні, чым у цяжкіх і шчыльных.

У перыяд паружавення бутонаў пільшчыкі канцэнтруюцца на сартах, цвіценне якіх пачынаецца раней. Масавы лёт і адкладванне яек самкамі адбываецца ў час цвіцення. У канцы цвіцення з яек утвараюцца лічынкі, якія пранікаюць у завязі.

За лічыначны перыяд, які доўжыцца каля месяца, адна лічынка пашкоджвае да 6 пладоў, перасяляючыся з аднаго ў другі.

Больш за ўсё пашкоджваюцца кветкі і плады тых сартоў, якія рана зацвітаюць. Шкоднікі аддаюць перавагу дрэвам з найбольш пышнай квеценню, загушчанай кронай і якія ахаваны ад ветру. У гады з расцягнутым перыядам цвіцення шкоднасць пільшчыкаў значна ўзрастае. Слівовыя пільшчыкі могуць знішчыць да 90 працэнтаў, а яблыневы і грушавы — да 50 працэнтаў ураджаю.



**Для таго, каб зберагчы ўраджай, трэба:**

— увосень праводзіць перакопку прыствольных кругоў на глыбіню 10—20 см для знішчэння лічынак;

— рабіць стрэсванне з дрэў перад і ў час цвіцення на подсцілку дарослых асобін і знішчаць іх. Гэта мерапрыемства лепш за ўсё праводзіць у пахмурнае надвор'е, калі шкоднікі маларухомыя;

— перыядычна стрэсваць з дрэў на подсцілку апалыя і пашкоджаныя завязі з лічынкамі, збіраць і знішчаць іх.

Калі шкоднікаў многа, акрамя механічных метадаў праводзяць апырскванне слівы ў канцы цвіцення, яблыні і грушы — у перыяд закрыцця чашалісцікаў. Для апрацоўкі выкарыстоўваюць адзін з наступных прэпаратаў: арыва 25-працэнт. к.э. (1,6—3 мл); дэцыс, 2,5-працэнт. к.э. (5—10 мл); каратэ, 5-працэнт. к.э. (4—8 мл); фастак, 10-працэнт. к.э. (1,5 мл) ці любы іншы дазволены інсектыцыд. Нормы расходу прэпаратаў прыводзяцца з разліку на 10 л вады.

# РАШЭННЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## Аб праве абскарджання ў суд пісьмовага папярэджання аб парушэнні заканадаўства рэлігійнай арганізацыяй

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Васілевіча Р.А., намесніка Старшыні Марыскіна А.У., суддзяў Бойка Т.С., Данілюка С.Я., Кенік К.І., Падгрушы В.В., Філіпчык Р.І., Цікавенкі А.Г., Шукліна В.З. разгледзеў на падставе часткі першай артыкула 116 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь зварот рэлігійнай арганізацыі аб праве абскарджання ў суд дзеянняў Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, які вынес ёй пісьмовае папярэджанне аб парушэнні заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

У звароце ўказваецца, што суды адмаўляюць у прыняцці заявы аб абскарджанні ў судовым парадку пісьмовага папярэджання, вынесенага Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў (далей — Упаўнаважаны па справах рэлігій), матывуючы адмову адсутнасцю ў заканадаўстве нормаў, якія рэгулююць парадак абскарджання такіх дзеянняў.

Прааналізаваўшы палажэнні Канстытуцыі, Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса (далей — ГПК), Працэсуальна-выканаўчага кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, законаў і іншых нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь, якія датычацца даследуемых пытанняў, Канстытуцыйны Суд устанавіў наступнае.

Згодна з часткай першай артыкула 60 Канстытуцыі, кожнаму гарантуецца абарона яго правоў і свабод кампетэнтным, незалежным і непрадузятым судом у вызначаныя законам тэрміны.

У адпаведнасці з часткай першай артыкула 23 Канстытуцыі абмежаванне правоў і свабод асобы дапускаецца толькі ў выпадках, прадугледжаных законам, у інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны маралі, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асобаў.

У пункце 3 часткі першай артыкула 37 ГПК устаноўлена, што агульным судам падведамныя справы, якія ўзнікаюць з адміністрацыйна-прававых адносінаў, пералічаныя ў артыкуле 335 ГПК. На падставе пункта 5 артыкула 335 ГПК суд разглядае справы па скаргах на дзеянні (бяздзеянне) дзяржаўных органаў і іншых юрыдычных асобаў, а таксама арганізацый, што не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, і службовых асобаў, якія ўшчамляюць правы грамадзян, а ў выпадках, прадугледжаных актамі заканадаўства, — і правы юрыдычных асобаў. Згодна з артыкулам 358 ГПК, юрыдычныя асобы, якія лічаць, што неправамернымі дзеяннямі (бяздзеяннем) дзяржаўных органаў, юрыдычных асобаў, а таксама арганізацый, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, і службовых асобаў ушчэмлены іх правы, маюць права звярнуцца ў суд са скаргай у парадку, прадугледжаным параграфам 6 главы 29 ГПК, і ў выпадках, прама прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Пад заканадаўствам Рэспублікі Беларусь разумеецца сістэма нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць грамадскія адносіны (абзац пяты артыкула 1 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь»), да якіх адносіцца і Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (артыкул 2 указанага Закона). Артыкул 137 Канстытуцыі замацоўвае яе вышэйшую юрыдычную сілу. У выпадку разыходжання закона, дэкрэта або ўказа з Канстытуцыяй дзейнічае Канстытуцыя.

У частцы першай артыкула 37 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» (далей — Закон аб свабодзе сумлення) прадугледжана, што ў выпадку парушэння рэлігійнай арганізацыяй заканадаўства Рэспублікі Беларусь або ажыццяўлення дзейнасці, якая супярэчыць статуту рэлігійнай арганізацыі, рэгіструючы орган выносіць пісьмовае папярэджанне, якое ў трохдзённы тэрмін накіроўваецца кіруючаму органу рэлігійнай арганізацыі.

Дзяржаўную рэгістрацыю рэлігійных аб'яднанняў у адпаведнасці з абзацам семнаццатым пункта 6 Палажэння аб Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў і яго апараце, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2006 г. № 891 (далей — Палажэнне), ажыццяўляе Упаўнаважаны па справах рэлігій.

Парадак абскарджання ў агульны суд пісьмовага папярэджання Упаўнаважанага па справах рэлігій Законам аб свабодзе сумлення і Палажэннем не прадугледжаны.

Разам з тым дзеянні Упаўнаважанага па справах рэлігій (вынясенне пісьмовага папярэджання) цягнуць пэўныя прававыя вынікі. Так, згодна з часткай другой артыкула 37 Закона аб свабодзе сумлення, калі парушэнні, указаныя ў пісьмовым папярэджанні, на працягу шасці месяцаў не будуць ліквідаваны або будуць мець месца паўторна на працягу года, рэгіструючы орган мае права звярнуцца ў суд з заявай аб ліквідацыі рэлігійнай арганізацыі. Пры гэтым рэгіструючы орган мае права прыняць рашэнне аб прыпыненні дзейнасці рэлігійнай арганізацыі да вынясення судовага рашэння.

Законам Рэспублікі Беларусь «Аб палітычных партыях» прадугледжана, што пісьмовае папярэджанне, вынесенае палітычнай партыі рэгіструючым органам, можа быць абскарджана ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь у месячны тэрмін пасля яго атрымання (частка трэцяя артыкула 30).

Аналагічная норма прадугледжана ў Законе Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб'яднаннях». Так, часткай чацвёртай артыкула 27 гэтага Закона ўстаноўлена, што пісьмовае папярэджанне, вынесенае міжнароднаму або рэспубліканскаму грамадскаму аб'яднанню, саюзу, у месячны тэрмін пасля яго атрымання можа быць абскарджана ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь. Пісьмовае папярэджанне, вынесенае мясцоваму грамадскаму аб'яднанню, саюзу, у месячны тэрмін пасля яго атрымання можа быць абскарджана ў абласныя, Мінскі гарадскі суды па месцы знаходжання кіруючага органа гэтага грамадскага аб'яднання, саюза.

Канстытуцыйны Суд адзначае, што хоць у Законе аб свабодзе сумлення прама не прадугледжана права судовага абскарджання пісьмовага папярэджання, якое выносіцца ў адрас рэлігійнай арганізацыі ў выпадку парушэння ёю заканадаўства Рэспублікі Беларусь, у ГПК ёсць глава 29, што прадугледжвае, у прыватнасці, парадак абскарджання дзеянняў службовых асобаў, якія ўшчамляюць правы юрыдычных асобаў.

Канстытуцыйны Суд у заключэннях ад 24 чэрвеня 1998 г. «Аб адпаведнасці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь артыкула 267 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, пункта 2 пастановы Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 20 верасня 1990 г. № 7 «Аб практыцы разгляду судамі Рэспублікі Беларусь скаргаў на дзеянні органаў і службовых асобаў у сувязі з накладаннем адміністрацыйных спагнанняў», ад 13 мая 1999 г. «Аб адпаведнасці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і міжнародна-прававым актам часткі шостай артыкула 209 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь» і штогадовых пасланнях аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь неаднаразова звяртаў увагу на прамое дзеянне часткі першай артыкула 60 Канстытуцыі з прычыны патрабаванняў, замацаваных у артыкуле 137 Асноўнага Закона, указваючы пры гэтым, што права на судовую абарону адносіцца да агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права, прыярытэт якіх Рэспубліка Беларусь, згодна з артыкулам 8 Канстытуцыі, прызнае і забяспечвае адпаведнасць ім заканадаўства.

Прадугледжанае ў частцы першай артыкула 60 Канстытуцыі палажэнне з'яўляецца важнай гарантыяй абароны правоў і законных інтарэсаў не толькі грамадзян, але і юрыдычных асобаў (у тым ліку рэлігійных арганізацый).

На падставе выкладзенага і кіруючыся часткай першай артыкула 116 Канстытуцыі, артыкуламі 22 і 24 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, артыкуламі 7, 36, 38, 40, 401 Закона «Аб Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь», Канстытуцыйны Суд

**ВЫРАШЫЎ:**

1. Пацвердзіць выказаную ў заключэннях ад 24 чэрвеня 1998 г., ад 13 мая 1999 г. і штогадовых пасланнях Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь прававую пазіцыю Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь аб прамым дзеянні нормы артыкула 60 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, якая гарантуе права на судовую абарону.

2. Гэта рашэнне ўступае ў сілу з дня прыняцця.

3. Апублікаваць гэта рашэнне ў адпаведнасці з заканадаўствам.

**Старшынствуючы — Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**
**Р.А. ВАСІЛЕВІЧ.**

*5 красавіка 2007 г., г. Мінск*
*№ Р-199/2007*

Нататкі мастака

# ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ



## ЛЕ КАРБЮЗЬЕ І МАДУЛЁРЫ...

Апошнім часам творцы амаль не заўважаюць чалавека. Яны бачаць Бога, цікавяцца міфічнымі героямі, размаўляюць з анёламі, а пра чалавека забываюцца. Знаходзяцца нават такія мысляры, якія, заплюшчыўшы вочы, прамаўляюць тэзы кшталту «мяне няма». У падобных абставінах самы час паглядзець на чалавека. Як для мяне, у еўрапейскай цывілізацыйнай прасторы існуюць два праграмныя малюнкі чалавека. Першы быў створаны Леанарда, а другі — Ле Карбюзье. Чалавек, прынамсі, еўрапеец — жывёла архітэктурная. Ён, ствараючы архітэктуру, ёй жа і падпарадкоўваецца. Таму я і вылучаю мадулёра — матэматычна дасканалага, убачанага вокам архітэктара і праверанага часам на трываласць. Для мяне сучасны чалавек выглядае як мадулёр, выштукаваны Ле Карбюзье. Адзінае, што варта было б дадаць у схемы майстра — постаць жанчыны. І Леанарда, і Ле Карбюзье за модуль бралі мужчынскае цела, а варта ўзяць адразу дзве постаці — Адама і Еву. Чалавек XXI стагоддзя мае дзве постаці, прынамсі, так бачыць маё вока.

## МІРАСЛАЎ І ЧЭСІК...

Брат мой Міраслаў па тэлефону сварыцца на сына Чэся за тое, што той не выходзіць раніцай на прабежку ў парку. Міраслаў яшчэ спрабуе дагукацца да сына, узмацняе голас, спадзеючыся такім чынам пераадолець адлегласць, што з кожным днём павялічваецца паміж ім і Чэславам. У брата ёсць спадзевы, а ў мяне іх няма, дзеці мае выраслі, сварыцца і крычаць на іх бессэнсоўна і нават небяспечна, бо можна страціць павагу, якая яшчэ ёсць у іх да мяне.

## ГЁТЭ І НОВАЕ ЖЫЦЦЁ...

Не стаў бы Гётэ супервядомым літаратарам, каб не перапісаў гісторыю пра доктара Фаўста, а той доктар не праславіўся б на ўвесь свет, каб не абмяняў сваё старое жыццё на новае і маладое; таму і дзівяць мяне заявы прымітыўных людзей, што сцвярджаюць: «Я ніколі не прамяняў бы сваё пражытае жыццё ні на якое іншае!» Такім людзям ніхто і не прапаноўвае мяняць іх нікчэмныя жыцці на новыя і лепшыя, а калі не прапаноўваюць, дык і не памяняеш, каб і захацеў.

## КУЛІН І ДЗЕСЯЦЬ РУБЛЁЎ...

«Дзесяць рублёў — купюра, за якую нічога не купіш. Купюра ёсць, а купіць за яе нельга нічога,» — пачуў я днямі на вуліцы... Пасля працы я заходжу ў кавярню «Акварыюм» выпіць кавы. Сам сябе часам папракаю за гэткае марнаванне часу. Мог бы нешта патрэбнае зрабіць, а сяджу і нічога не раблю, і магу так прасядзець гадзіну, а магу і дзве. І сяджу я ў гэтай краме «Цэнтральнай» не год і не два, а блізу трыццаці гадоў. Раней я віно піў і гарэлку, а цяпер толькі каву і гарбату. За трыццаць гадоў шмат што змянілася, да прыкладу: усё больш і больш мужчын п'юць гарбату з цытрынаю і выглядаюць дагледжанымі ды стыльнымі, а жанчыны наадварот папіваюць піва і віно, гавораць пра палітыку, пра пасады з узнагародамі ды не даглядаюць сябе, фемініствуюць... Учора Гена Хацкевіч спытаў, дзе я буду на свята. Я сказаў, не ведаю, а сам падумаў, што тут і буду, каля ўніверсама «Цэнтральны». А дзе ж яшчэ? За Генаю ў «Акварыюм» занырнуў Лёша Кулін: «Скульптуру зрабіў. Невялічкую. Знайшоў рух, жэст знайшоў і ў скульптуру загнаў. Атрымалася. Адліў яе з бронзы. Сто тысяч аддаў і адліў. Адны страты, а прыбыткаў ніякіх. Каму трэба скульптура?» — «У салон занясі. У вітрыне пастаў. Можа хто купіць, а калі і не прадасца, дык людзі паглядзяць...» — «Думаеш?» — «Думаю...» — «А я думаю: скульптура — цяжкі занятак, такі, як баявое каратэ!» Скульптар-баец пайшоў да стойкі, па гарбату, а я выйшаў выпаліць цыгарэту на ганку. З кардоннай шклянкаю гарбаты Лёша Кулін прайшоў паўз мяне і перад тым, як спусціцца ў падземны пераход, ён скамечыў і выкінуў дзесяць рублёў. Купюра ляжала на ходніку, міма ішлі людзі. Я паліў і чакаў, хто падбярэ грошы. Салдаты? Не падабралі. Дзеці? Не нахіліліся. Студэнты, старыя? Не, не, не... У нас усе багатыя. Ніхто не нахіліцца за дзесяткаю, на якую нічога не купіш. У нас усе скардзяцца на кошты і адсутнасць грошай, але за дзесяць рублёў нахіліцца лянуюцца. Вецер прыгнаў дзесятку да майго чаравіка, я падняў грошы і вярнуўся ў «Акварыюм».

## МАРА, ІДЭЯ І ДЗІВА...

Пакуль на інфармацыйных палях ідзе халодная бойка паміж амерыканскімі марамі і рускімі ідэямі, Еўропа набывае сабе прыхільнікаў. Прынамсі, так адбываецца ў Беларусі. Еўра, еўрарамонт, еўрастандарт, еўрапейцы, еўразвяз — словы, што ўсё часцей чуе беларускае вуха. Амерыка так і застаецца з мараю, а Расія — з ідэямі, Еўропа набывае рэальную значнасць. Амерыканскія і расійскія прапагандысты ў Беларусі займаюцца выключна крытыкай беларускіх рэаліяў, бо ўпэўнены ў прывабнасці сваіх ідэй і мараў, яны не заўважылі, як пабляклі іх мары і састарэлі ідэі. Яны губляюць сваіх гледачоў, слухачоў, чытачоў і прыхільнікаў. Будаўнікі беларускай дзяржаўнасці ўсё больш і больш захапляюцца еўрапейскасцю і мадэлямі, што прапаноўвае для жыцця Еўразвяз. Кітайскае дзіва, зноў жа, спрыяе еўрапеізацыі Беларусі, з-за сваёй падкрэсленай азіяцэнтрычнасці.

## СВІФТ І БЕДЛАМ...

У сваім «Дзённіку для Стэлы» Джонатан Свіфт распавёў, як наведаў бедлам — вар'ятню — пасля таго, як схадзіў у звярынец і лялечны тэатар. У часы Свіфта наведванне бедламу было распаўсюджаным з'явай. Вар'ятні адчынялі свае дзверы для цікаўных наведнікаў. Цяпер, праз 297 гадоў, наведацца ў дом вар'ятаў даволі складана, больш за тое, цябе палічаць за падобную цікавасць чалавекам неадэкватным. У мяне на гэты конт іншае меркаванне, бо як мастака і літаратара мяне заўсёды вабілі самыя розныя твары людзей, твары ж вар'ятаў маюць неверагодную выразнасць. Таму і Эль Грэка, і Гоя, і Пікаса шмат малявалі не зусім нармальных і зусім ненармальных персанажаў. Толькі гэта ўсё ж выключэнні. Маляванне, фатаграфаванне і здыманне на тэлекамеру вар'ятаў — занятак небяспечны. Свіфт, які сам страціў розум напрыканцы жыцця, найлепшы гэтаму доказ. Але ў дадзеным факце, апісаным Джонатанам Свіфтам, мяне зацікавіла не столькі вар'ятня, колькі звярынец. Можа, праз 297 гадоў наведванне звярынцаў са змучанымі жывёламі таксама стане амаральным для большасці людзей.

**Адам ГЛОБУС.**

# «СТАРОНКА БЕЛАРУСКАЯ МАЯ»



***Ад узнёслага пад нябёсы да самага зямнога, — усё гэта зроблена рукамі землякоў, усё ўпрыгожвае Вілейскі край і застаецца для нашчадкаў як след папярэднікаў на зямлі. Пра адмыслова сплеценую дзіцячую тапку гераіня нашага рэпартажу Дзіна Квяткевіч так і кажа — маленькі слядочак на шырокім шляху.***



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ЗЯМЛЯ І ЛЮДЗІ МІНШЧЫНЫ

**Давялося нядаўна пабываць у Любані. Не, не ў вядомым райцэнтры на ўскрайку беларускага Палесся, а ў вёсцы, што на Вілейшчыне. Яна — цэнтр аднайменнага сельсавета, самая буйная ў сваёй акрузе. Летась стала другім па ліку ў раёне аграгарадком. Тут сёння больш за тысячу жыхароў, а ва ўсіх навакольных трох дзесятках вёсак — 2 тыс.**

Зразумела, яны намнога меншыя, чым Любань — дзе дзесяць, восем, нават тры чалавекі засталіся свой век дажываць. У асноўным, канешне, у невялікіх вёсках адны старыя. Дарэчы, пенсіянераў сярод жыхароў сельсавета трэцяя частка. Дзяцей каля паўтысячы, яны наведваюць дзве школы: у Любані сярэднюю, а ў Журыхах пачатковую з садком аб'ядналі. Змяншаецца колькасць жыхароў — такая апошнім часам тэндэнцыя. Таму і ўстановы адукацыі даводзіцца закрываць. А раней, як узгадала сакратар Любанскага сельскага Савета Вольга Баслык, ледзь не ў кожнай вёсцы была свая пачатковая школа.

Між тым, хапае ў гэтых мясцінах і радасных навін. Гадоў з пяць таму ў Любані з'явілася свая царква — храм у гонар беларускіх святых. Гэтую справу некалі «выцягнуў» мясцовы святар Ігар Шалуха. Будоўля прайшла пры актыўным удзеле мясцовых жыхароў — за іх ахвяраванні. Так што можна смела казаць, што царкву, як і ў былыя часы, узводзілі ўсёй талакой. Усё ад сэрца, з самымі светлымі думкамі і пачуццямі, мабыць, таму і атрымаўся будынак вельмі прыгожы. Гэтая царква адзіная на ўвесь сельсавет, на службу сюды прыходзяць людзі з усёй вялікай акругі.

Месцічы часта збіраюцца разам, спяваюць, займаюцца рамяством, а то і проста абмяркоўваюць апошнія навіны. У горадзе такога няма, таму калі прыязджаеш у вёску, адразу менавіта на ўзаемаадносіны паміж людзьмі ў першую чаргу і звяртаеш увагу. Яны зусім іншыя — напэўна, больш блізкія і нераўнадушныя. Дзе вы ў горадзе знойдзеце ўстанову з шыльдай «Народны дом»? А ў Талуці (яна — за дванаццаць кіламетраў ад Любані) ён стаў сапраўдным культурным цэнтрам (хоць і размясціўся на ўскрайку вёскі). Дарэчы, не толькі ў тутэйшых мясцінах, а і далёка за межамі Вілейскага раёна пра народны дом ведаюць.

На першым паверсе бібліятэка. Што чытаюць?

— Ды рознае чытаюць, — кажа дырэктар народнага дома Міраслава Сільвановіч. — Адна жанчына толькі ваеннай тэматыкі кніжкі бярэ, а ў асноўным любоўныя раманы карыстаюцца попытам. Пажадана, каб яны вялікімі літарамі былі надрукаваны — зрок у старых слабы. Дзятва ў асноўным школьную праграму асвойвае, ды пра прыгоды розныя чытае. Пры жаданні можна знайсці любую патрэбную кнігу — з Любані літаратуру да нас прывозяць, можна нават з Вялейкі (менавіта так Міраслава Уладзіміраўна і сказала. — **М.Л.**) праз цэнтралізаваную бібліятэчную сістэму заказаць.

На другі паверх вядзе акуратная лесвіца, там адзін вялікі пакой самай сапраўднай народнай майстэрні: заўважаеш прасніцы, калаўроты, кросны. Раней такія бачыў хіба толькі ў музейных экспазіцыях, а тут яны, што называецца, «у справе». «Раней Талуць была вядомым цэнтрам ткацтва, — заўважае Міраслава Сільвановіч. — Не страцілі жыхары сакрэтаў таго рамяства і цяпер — ледзь не ў кожнай хаце дасюль кросны стаяць. Жанчыны ткуць розныя рэчы — а чым яшчэ ўвечары, асабліва ўзімку, займацца?». Увогуле, у народным доме пастаянна працуюць дванаццаць (!) розных гурткоў. Сярод іх — вакальны, фальклорны, вязання, саломапляцення, макрамэ. А таксама два ткацкія, кожны са сваёй асаблівай спецыялізацыяй — у адным ручнікі ткуць, а ў другім — посцілкі. Усе рэчы ў пакоі зроблены рукамі вяскоўцаў і займаюць звыклае месца: дываны на сценах, посцілкі на лавах, фіранкі на вокнах, абрусы на сталах, ходнікі на падлозе. Пад столлю — розныя сімпатычныя саламяныя павучкі-ахоўнікі, а таксама самаробныя драўляныя жырандолі (тутэйшыя разьбяры — вялікія ўмельцы).



Тут размясціўся Народны дом.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Кіраўніца гуртка «Роднае слова» — Дзіна Карлаўна Квяткевіч — расказвае верш Купалы «Бабулька — прадаўчыца зёлак»:

*...І кепска бабульцы —*  
*Старая, сівая.*  
*Брак сіл працаваці,*  
*Дык зёлкі збірае.*  
*Нясе іх да Мінску,*  
*На рынку садзіцца,*  
*Збывае і вучыць,*  
*Як трэба лячыцца.*  
*А можа паможа*  
*Душы хоць адной дзе,*  
*І праца бабулькі*  
*Намарна ня пойдзе.*

«Гэты верш Купала сто гадоў таму напісаў — у 1907-м, — тлумачыць Дзіна Карлаўна. — Думаю, што яго будзе дарэчы падчас святкавання вялікай гадавіны з дня яго нараджэння ўзгадаць». Увогуле бабуля Дзіна (так яе тут усе называюць) — сапраўдная мясцовая знакамітасць. Мала ад каго яшчэ пачуеш такую сакавітую, трапную родную мову. А таксама цікавыя аповеды пра жыццё, якое было, са смехам кажа Дзіна Карлаўна, быццам бы які «серыял». Нарадзілася ў Чэрвеньскім раёне ў 1929 годзе, жыла ў Мінску (дзе на Кальварыйскіх могілках пахавана яе маці), пасля бацьку перавялі ў Гомель, там і сустрэлі вайну.

Падчас Кастрычніцкай рэвалюцыі бацька быў паранены, таму яго ў войска не ўзялі. «Раскажу вам адзін сакрэт, — адступаецца ад тэмы бабуля Дзіна. — Ніякая я не Карлаўна, бацька мой быў Кірылам. Гэта ён пасля рэвалюцыі некалькі літар у імені, што было запісана ў метрыцы змяніў і зрабіўся Карлам — моднае і актуальнае па тых часах імя (усё ж такі — Карл Маркс, Карл Лібкнехт)».

— Можа вам расказаць пра нашу вёску? — пытаецца бабуля Дзіна. — Ну, дык слухайце, правяду экскурсію. Спачатку ФАП: як падняўся ў бабы ціск, паднялі суседзі піск — трэба бабу ратаваць, бо няма за што хаваць. Побач — аддзяленне сувязі, там мы свае грошы атрымліваем: а тут і пенсію далі па высокай меры, цяпер мы добра зажывём, спадарыня Вера. Пасля — крама: зойдзеш у краму, адчуеш прамашку — тры тысячы аддасі за алею пляшку. А далей так: пайшла на пенсію — у крымплен адзелася, рукі-ногі аддыхнулі, у клуб мне захацелася. Гэта пра наш народны дом. Вось такое ў нас цудоўнае месца.

І сапраўды — проста ўнікальныя мясціны. Гэта і мінчане ацанілі, апошнім часам жыхары сталіцы пачалі тут купляць жыллё пад дачы. І з'язджаюць з мегаполісу, каб паслухаць цішыню і падыхаць сапраўдным паветрам. Завітваюць у народны дом і іншаземцы — часта прыязджаюць немцы. Купляюць сувеніры, слухаюць песні, нават вучацца нешта рабіць сваімі рукамі. Аднойчы іх вазілі ў лес і паказвалі партызанскія зямлянкі.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***Такія калыскі былі і ў нашай хаце, прыгадвае Дзіна КВЯТКЕВІЧ.***

«У дарогу» бабуля Дзіна прачытала яшчэ адзін верш (колькі я пачуў іх за наша нядоўгае спатканне!):

*Ты для мяне на ўсёй зямлі адзіная,*  
*І колькі буду жыць на свеце я,*  
*Мая навекі вечная Радзіма —*  
*Старонка беларуская мая...*

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

*Вілейскі раён.*

## Сёння

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.17 | 20.05 | 13.48 |
| Віцебск — | 6.04 | 19.57 | 13.53 |
| Магілёў — | 6.07 | 19.55 | 13.48 |
| Гомель — | 6.07 | 19.49 | 13.42 |
| Гродна — | 6.33 | 20.19 | 13.46 |
| Брэст — | 6.36 | 20.17 | 13.41 |

### Імяніны

**Пр.** *Засімы, Івана, Сафрона;*

**К.** *Віктара, Зянона, Людаслава, Юльяна.*

### Месяц

*Апошняя квадра 10 красавіка.*

*Месяц у сузор'і Вадалея.*

## Надвор'е на заўтра




## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА | +15 — +17°С | Без ападкаў |
| ВІЛЬНЮС | +10 — +12 °С | Без ападкаў |
| КІЕЎ | +12 — +14 °С | Без ападкаў |
| МАСКВА | +3 — +5 °С | |
| РЫГА | +9 — +11 °С | Без ападкаў |
| С-ПЕЦЯРБУРГ | +3 — +5 °С | |

Дзве даты

## 12 красавіка



**1919 год** — у Маскве, на станцыі «Сартаравальная», адбыўся першы камуністычны суботнік, названы Леніным «вялікім пачынам».

**1961 год** — адбыўся першы палёт чалавека ў космас. Юрый Гагарын правёў на калязямной арбіце 1 гадзіну 48 хвілін, зрабіўшы на караблі «Усход-1» адзін віток вакол Зямлі. Спускаемы апарат прызямліўся на беразе ракі Волга, а 14 красавіка Масква сустракала героя грандыёзным мітынгам.

Цытата дня:

***«Людзі ў пераважнай большасці сваёй жыва цікавяцца ўсім, чым заўгодна, за выключэннем таго, што сапраўды трэба ведаць».***

**Оскар Уайльд (1854—1900), англійскі пісьменнік.**

Глядзіце!

# САКРЭТНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ «ДОБРАЙ РАНІЦЫ»

## Карэспандэнт «Звязды» стала тэлевядучай. На паўгадзіны

**«Добрай раніцы, Беларусь!» — пад гэтае прывітанне-заклік з тэлеэкранаў вось ужо дзесяць гадоў прачынаюцца мільёны беларусаў. Пазітыў, інфармацыйная насычанасць, ненавязлівасць, лёгкасць атмасферы — гэта і ёсць рэцэпт папулярнасці. Нездарма ўвесь час свайго існавання праграма лічыцца адной з лепшых у ранішнім эфіры Беларусі.**



«Мы неяк падлічылі: за 10 гадоў праз эфірную «кузню» прайшлі роўна 40 вядучых, імёны якіх і сёння ўсім знаёмыя — Кірыл Слука, Сяргей Кухто, Яўген Юранаў, Надзея Герасімчык, Ларыса Грыбалёва і іншыя «зоркі», — расказаў намеснік дырэктара Першага канала Аляксандр Капёнкін. Зараз на прамых эфірах праграмы працуюць тры пары вядучых: Святлана Бароўская і Аляксандр Паўлаў, Вольга Шлягер і Аляксандр Аўчыннікаў, Вольга Водчыц і Дзмітрый Карась. Акрамя таго, відэаагляды вядуць Валянціна Мішанева і Кацярына Купчанка. Усяго ж у студыі падчас кожнай праграмы працуе каля 20 чалавек, прычым для большасці з іх падняцца а 5-й гадзіне раніцы, каб на пачатку 8-й падарыць гледачам зарад бадзёрасці і добрага настрою — справа звыклая і звычайная. «Падняцца не праблема, — жартуе легендарны аператар Віктар Мілько-Чарнаморац. — Затое ў дзевяць вечара ўжо валішся з ног. Калі чалавек нават па жыцці сава, тэлебачанне з лёгкасцю ператварае ў жаўрука».

### ШАНЦ НА СУРВЭТЦЫ

Насамрэч юбілей «Добрай раніцы, Беларусь!» адзначыла яшчэ ў студзені, але святочныя сюрпрызы будуць на працягу ўсяго года. Адным з падарункаў для праграмы стала новае афармленне, якое дадало дынамічнасці і фарбаў тэлевізійнай раніцы — зразумела ж, добрай. У якасці другога, напрыклад, задумана сабраць усіх вядучых — былых і цяперашніх — у адной студыі. Кожнаму з іх ёсць што сказаць, галоўнае, каб часу хапіла.

Візіт у студыю «Добрай раніцы, Беларусь!» журналістаў рэспубліканскіх СМІ — так, звычайная рабочая нагода, магчымасць «падгледзець» прамы эфір. Пачаставалі чаем і печывам, запісалі некалькі пажаданняў тэлевізійнікам ад калег-газетчыкаў. Дзіўна было хіба толькі тое, што нас адразу папрасілі далёка не разыходзіцца, а гледачам паабяцалі «перамену роляў».

— Будзеце рабіць выпуск праграмы, — патлумачыла выканаўчы прадзюсар Наталля Марынава. — Нехта стане рэжысёрам, нехта — аператарам, камусьці дастанецца роля вядучага.

Наш лёс вырашылі... звычайныя сурвэткі, на кожнай з якіх стаяла лічба — ад 1 да 13. У залежнасці ад нумара, які дастаўся, мы атрымлівалі часовую «пасаду» і ішлі на інструктаж да спецыялістаў. Паралельна каманда тлумачыла, чым займаецца той ці іншы прафесіянал: адзін піша тэксты для праграмы, другі нясе адказнасць за тытры, трэці пераключае відэасюжэты, чацвёрты сочыць за гукам, пяты кантралюе работу «тэлесуфлёра», шосты вядзе хранаметраж... І кожны — на сваім месцы, і разам з тым у звязцы з іншымі, інакш немагчыма падрыхтаваць якасны эфір або справіцца з пазаштатнай сітуацыяй.

Мне выпала — ніколі б не падумала! — роля вядучай. У кампанію трапілі таксама Ілья Свірын з «Культуры» і Марына Кузьміч з «Народнай газеты». Пакуль грымёр наводзіла прыгажосць, а асістэнты мацавалі мікрафоны, мы няўцямна пераглядваліся: што гаварыць? Вось так, без рэпетыцыі, і адразу на камеру?

— Вушы! У вядучых няма вушэй! — раздаўся голас аднекуль зверху. Мы нервова схапіліся за вушы — як быццам на месцы. Аказалася, трэба яшчэ прычапіць мікраскапічныя навушнічкі.

### МАЙСТАР-КЛАС І ПЕРШЫ БЛІН

— Не трэба так палохацца, — супакоіла нас Святлана Бароўская. Ёй лёгка гаварыць — яна профі, уладальніца «Тэлевяршыні» як лепшая вядучая інфармацыйна-забаўляльнай праграмы. — Галоўнае — расслабіцца. Лепш за ўсё ўявіць кагосьці канкрэтнага — маму, дзіця, сябра — да каго і трэба звяртацца. І прывітальнае «Добрай раніцы!» адрасаваць яму — тады выходзіць шчыра, і гэтая шчырасць пера-даецца ўсім гледачам.

— Не хвалюйцеся, нічога страшнага, — заўважыў, падыходзячы бліжэй, вядучы Аляксандр Паўлаў. — Галоўнае — сабрацца.

— Як — сабрацца? А Святлана сказала, разняволіцца... — зусім згубіліся мы.

— Разняволіцца ў сэнсе настрою, а сабрацца, каб вымавіць без памылак першыя словы: «Прывітанне! Гэта праграма «Добрай раніцы, Беларусь!» на Першым тэлеканале і спадарожнікавым канале «Беларусь-ТБ». Далей ужо можна не так строга, даваць нешта ад сябе, толькі прытрымлівацца сцэнарыя.

Голас зверху — з апаратнай — адлічваў апошнія секунды да «эфіру». Тры, два... Аператары — сапраўдны і навaспечаны — замахалі рукамі, маўляў, трэба ўжо гаварыць. Я падумала, што раніца сёння, нягледзячы на снег, усё-ткі добрая, усміхнулася ў камеру (ці ў тую, куды трэба было?) і, стараючыся не запінацца, выдала на адным дыханні вывучаны тэкст. Партнёр падхапіў. Хутка аркушы з тэкстам ужо не здаваліся адзінай выратавальнай саломінкай, і мы ўпрыгожылі яго «адсябяцінай». Адну падводку нават забыліся прачытаць, за што атрымалі ад «выпускаючага рэдактара» абяцанне пазбавіць прэміі. У перапынках наш «рэдактар» строга наказваў: «Больш аптымізму! Трэба, каб гледачы ўбачылі вас і павесялелі, а не заснулі! Менш глядзіце ў тэкст, размаўляйце на камеру!». «Аператары» забаранялі нам вельмі ўжо актыўна круціцца на крэслах. Сапраўдныя вядучыя, седзячы збоку, па-за зонай бачання камер, зацікаўлена глядзелі на «ролевыя гульні» дарослых людзей. А мы... Нават пашкадавалі, што «эфір» так хутка скончыўся.

— Ну, як глядзелася — не вельмі страшна? — звярнуліся мы па сваю порцыю крытыкі.

— Цудоўна атрымалася! — запэўніла вядучая Вольга Шлягер. — Мы ўжо меркавалі тут, што канкурэнты прыйшлі. Толькі вось рэдактар вам трапіўся вельмі строгі — наш звычайна падбадзёрвае, што мы самыя лепшыя, што ўсё будзе выдатна.

— А на «эксперымент наадварот», адчуць сябе супрацоўнікамі друкаваных выданняў, пагадзіліся б?

— Гэта было б цікава, новы вопыт, чаму не, — задумаўся Аляксандр Паўлаў.

З альтэрнатыўнага «выпуску» праграмы «Добрай раніцы, Беларусь!» тэлевізійнікі паабяцалі захоўваць «кампрамат» для гісторыі. З аднаго боку, не такі страшны эфір, як яго малююць, дый не такі просты, як падаецца на першы погляд. Скажам, вядучы — гэта далёка не толькі «галава, якая гаворыць» — яму трэба завязаць дыялог з любым госцем у студыі, быць гатовым да нечаканасцяў (Святлана Бароўская расказала, што аднойчы знік сцэнарый, і даводзілася «выкручвацца», выдумляючы нейкія рэпрызы ў фармаце праграмы), а таксама ўмець распараджацца часам — або цягнуць яго, колькі трэба, або наадварот, імгненна «падразаць» прамову, каб яна пры тым не згубіла сэнсу. І яшчэ — шчыра ўсміхацца, каб прапанова «Заставайцеся з намі» знаходзіла паўсюдны водгук. Затое прамы эфір шчодра адорвае сваіх верных вядучых драйвам і пазітыўнай энергетыкай. Яны таму ўсе так добра і выглядаюць — бо раніца ў іх добрая... А ў вас?

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

*Фота прадастаўлена прэс-службай Белтэлерадыёкампаніі.*

220004 , г. Минск
ул. Мельникайте, 2

Тел./факс (017)209-40-67
Тел. 209-40-28

БРУПЭИС «Белэксимгарант»

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС ЗА 2006 ГОД

млн.руб.

| АКТИВ | | ПАССИВ | |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **Основные средства** | **1929,1** | **Источники собственных средств, всего** | **5425,3** |
| **Нематериальные активы** | **14,1** | в том числе: уставный капитал | 4065,0 |
| **Финансовые вложения, всего** | **3013,7** | Резервный капитал | 265,8 |
| в том числе: инвестиции в дочерние общества | - | Добавочный капитал | 328,3 |
| Инвестиции в другие организации | 4,2 | Фонд накопления | 405,0 |
| Облигации и другие долговые обязательства | 3009,5 | Фонд потребления | - |
| Прочие финансовые вложения | - | Целевое финансирование | - |
| **Доля перестраховщиков в страховых резервах** | **949,3** | Нераспределенная прибыль прошлых лет | 189,6 |
| **Дебиторы, всего** | **370,9** | Нераспределенная прибыль отчетного года | 171,6 |
| В том числе: дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования | 81,7 | **Страховые резервы и фонды, всего** | **7643,3** |
| Депо премий по рискам, принятым в перестрахование | - | В том числе: страховые резервы | 7324,5 |
| Дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 289,2 | Фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 303,9 |
| **Прочие активы, всего** | **8092,4** | Гарантийный фонд | 14,9 |
| В том числе: незавершенное строительство | 119,4 | **Кредиторы, всего** | **459,3** |
| Материальные ценности и затраты | 514,6 | В том числе: кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования | 100,9 |
| Денежные средства | 7458,4 | Кредиторская задолженность по операциям перестрахования | - |
| Собственные акции (доли) | - | Депо премий по рискам, переданным в перестрахование | - |
| прочие активы | - | Заемные средства | 159,9 |
| **Непокрытые убытки прошлых лет** | - | Кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 198,5 |
| **Непокрытые убытки отчетного года** | **-** | **Прочие пассивы** | **841,6** |
| **БАЛАНС** | **14369,5** | **БАЛАНС** | **14369,5** |

БРУПЭИС «Белэксимгарант» ЗА 2006 ГОД

ОТЧЕТ О ФИНАНСОВЫХ РЕЗУЛЬТАТАХ

млн.руб.

| НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЯ | Код строки | За отчетный период |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| **1. Страхование жизни** | | |
| Страховые взносы (премии) | 010 | - |
| Страховые выплаты | 020 | - |
| Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -) | 030 | - |
| Отчисления в гарантийный фонд | 040 | - |
| Расходы на ведение дела | 041 | - |
| **Результат от операций по страхованию жизни (+ или -)** | 050 | - |
| **2. Страхование иное, чем страхование жизни** | | |
| Страховые взносы (премии) — нетто перестрахование | 064 | **13 415,9** |
| Изменение резерва незаработанной премии — нетто перестрахование (+ или -) | 067 | **-605,2** |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто перестрахование | 082 | **4 267,6** |
| Изменение резервов убытков — нетто перестрахование (+ или -) | 092 | **-1 042,0** |
| Изменение других технических резервов (+ или -) | 100 | - |
| Изменение других страховых резервов (+ или -) | 105 | - |
| Отчисления в фонд предупредительных мероприятий и гарантийные фонды | 110 | **1 063,3** |
| Расходы на ведение дела | 120 | **4 283,7** |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование | 121 | **112, 0** |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование | 122 | **109,0** |
| **Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)** | 130 | **2 157,1** |
| **3. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы 1 и 2** | | |
| Операционные доходы | 140 | **709,3** |
| Операционные расходы | 145 | **7,2** |
| Внереализационные доходы | 150 | **226,3** |
| Внереализационные расходы | 155 | **241,4** |
| Финансовый результат | | **2 844,1** |
| **Использовано прибыли** | | **2 672,5** |
| **Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -)** | 170 | **171,6** |

Проведенный аудит дает достаточные основания для выражения аудиторского мнения о достоверности во всех существенных отношениях бухгалтерской (финансовой) отчетности БРУПЭИС «Белэксимгарант» и соответствии совершенных им финансовых (хозяйственных) операций законодательству Республики Беларусь.

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность за 2006 год отражает достоверно во всех существенных отношениях финансовое положение БРУПЭИС «Белэксимгарант» по состоянию на 1 января 2007 г. и финансовых результатов его деятельности за 2006 г.

Баланс и отчет о финансовых результатах подтверждены аудитором-предпринимателем Волочковой А.К. УНП: 100961335, лицензия на осуществление аудиторской деятельности выдана 15.02.2006 г. № 0061832 Министерством финансов РБ.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 35.265. Індэкс 63850. Зак. № 2028. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12